

Немцам даспадобы нашы блінцы



Лайдачыць стане нявыгадна



Суседзяў прынялі як сваіх

МС

СТАР. 3

СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ВЕРАСНЯ 2014 г. СЕРАДА № 166 (27776) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ШЧЫРА АБ ВАЖНЫМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю вядомаму расійскаму журналісту Сяргею Брылёву — вядучаму праграмы «Весткі ў суботу» на тэлеканале «Расія 1», паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы адказаў на комплекс пытанняў, звязаных з вынікамі сустрэчы прэзідэнтаў дзяржаў — членаў Мытнага саюза, Украіны з удзелам высокіх прадстаўнікоў Еўрапейскага саюза, якая прайшла ў Мінску 26 жніўня.

У кантэксце мінскага саміту Аляксандр Лукашэнка асобна пазначыў сваё бачанне ролі Беларусі і яе Прэзідэнта ў арганізацыі і правядзенні названай сустрэчы, якая адбылася на фоне трагічных падзей ва Украіне. «Мы належым аднаму славянскаму свету. І ў гэтым свеце ўспыхнуў пажар. І я гэта хваравіта і эмацыянальна ўспрымаю, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І калі мне пачынаюць казаць пра тое, што вось нейкія дывідэнды... Глупства поўнае! На гэтым гуляць ні ў якім разе нельга! Бяда ў людзей. І хто мы потым будзем, калі мы з гэтага пачнём даставаць нейкія гарачыя галавешкі і выкарыстоўваць для сябе?»

«Я проста зрабіў тое, чаго хацелі ўсе. Парашэнка хацеў у Мінску правесці гэты саміт. Ён у Расію не паехаў бы, вы ж разумееце, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Гэта не я крычаў: «Давайце, прыязджайце ў Мінск». Гэтая ідэя была Парашэнкі. І без Пуціна гэтая сустрэча тут не адбылася б». Аляксандр Лукашэнка падзяліўся меркаваннем пра шляхі больш хуткага ўрэгулявання ўнутрыўкраінскай сітуацыі, а таксама распавёў аб зробленых беларускім бокам кроках па змякчэнні некаторых гуманітарных наступстваў падзей, якія адбываюцца ва Украіне.

Падчас інтэрв'ю былі таксама падрабязна закрануты тэмы далейшай эвалюцыі Еўразійскага саюза, перспектыў узаемавыгаднай вытворчай кааперацыі Беларусі і Расіі ў галіне перапрацоўкі і паставак сельскагаспадарчай прадукцыі ва ўмовах уведзеных расійскім бокам абмежаванняў на імпарт тавараў з шэрагу краін.

Плануецца, што падрабязная версія інтэрв'ю выйдзе ў эфіры праграмы «Весткі ў суботу» на тэлеканале «Расія 1» 6 верасня.

## ЗБАЛАНСАВАНЫ БЮДЖЭТ

### Беларусь мае намер у 2015 годзе разлічыцца па ўсіх знешніх даўгах

**Аб гэтым учора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе разглядаўся праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2015 год, заявіў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік урада вылучыў прыярытэты законапраекта. «У першую чаргу, разглядаючы збалансаванасць бюджэту на 2015 год, мы павінны разумець, што нам трэба ў поўным аб'ёме разлічыцца па ўсіх знешніх даўгах. Гэта святое. Мы гэтыя сродкі бралі для мадэрнізацыі эканомікі, мы павінны выконваць усе ўзятыя на сябе абавязацельствы», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Асаблівую ўвагу неабходна надаваць пытанням валютнага балансу, у прыватнасці захаванню золатавалютных рэзерваў краіны, дадаў ён.

Закранаючы рашэнні мэтавых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, прэм'ер-міністр адзначыў: «Мы павінны разглядаць гэтыя пытанні, маючы на ўвазе неабходнасць далейшага ўмацавання і нацыянальнай бяспекі, і нацыянальнай эканомікі ў цэлым праз развіццё рэальнага сектара, праз пытанні, звязаныя з даходамі насельніцтва».

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу, што будучы год асаблівы, таму што завяршаецца пяцігодка. У сувязі з гэтым урад і Нацбанк павінны ўзяць на сябе асаблівыя абавязацельствы.



## ХТО — «НА БУЛЬБУ», ХТО — «НА МОРКВУ»

**Для некалькіх пакаленняў паездка на сельгасработы («на бульбу») на пачатку навучальнага года падчас студэнцтва — самы рамантычны і незабыўны час. Сучасныя студэнты таксама не застаюцца ў баку ад дапамогі сельгаспрадпрыемствам. Напрыклад, Вікторыя Паўлючкова і яе аднакурснікі, навучэнцы філіяла БДТУ Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа, збіраюць ураджай морквы ў СВК «Альгоўскае» Віцебскага раёна.**

Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ШУНЕВІЧ,
міністр унутраных спраў:**

***«Барацьба з карупцыяй павінна стаць у нас усенароднай справай. Законапраект па барацьбе з карупцыяй — гэта ўсяго толькі адзін з інструментаў, які дае дзяржава праваахоўнікам у гэтай барацьбе. Усё будзе залежаць ад яго выканання, ад таго, як ён будзе прымяняцца на практыцы. Калі ў грамадстве сфарміруецца глыбіннае непрыманне такіх негатыўных фактаў, тады і вынік будзе адпаведным. Кожны грамадзянін павінен разумець, што, прыходзячы ў паліклініку або любую іншую ўстанову і ў якасці падзякі перадаючы нейкія матэрыяльныя сродкі за тое, што прадстаўнік дзяржавы павінен зрабіць бясплатна, ён тым самым стымулюе карупцыю. Латэнтнасць гэтай антысацыяльнай з'явы яшчэ дастаткова высокая. Праваахоўнікі, акрамя тых законаў, якія прымаюцца дзяржавай, думаюць пра новыя спосабы і метады выяўлення карупцыянераў, нячыстых на руку кіраўнікоў».***

■ Камунальныя стасункі

## НЕ АПЛАЧВАЕМ І ПАЛОВЫ...



Фота Пятра ФАМІНА.

**Узровень пакрыцця сабекошту жыллёва-камунальных паслуг насельніцтвам за 2013 год склаў 24,4 %, а за першае паўгоддзе сёлета ён павялічыўся да 31%, паведаміў <u>дырэктар дэпартамента цэнавай палітыкі Мінэканомікі Ігар ФАМІН.</u> З улікам дзеяння мер, прадугледжаных існуючымі нарматыўна-прававымі актамі, да канца года гэты паказчык павінен значна павялічыцца. Пры гэтым тэрмін выхаду на 100-працэнтнае пакрыццё паслуг жыльцамі спецыялісты аб'яўляць не спяшаюцца.**

Краіна падыходзіць да гэтага хоць і марудна, але цвёрда, сведчаннем чаго стала чарговая індэксацыя тарыфаў на некаторыя паслугі. Так, з 1 верасня тарыфы на прыродны і звадкаваны газ, электра- і цеплаэнергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння для насельніцтва, што субсідзіруюцца дзяржавай, павялічыліся ў сярэднім на 9,8%. Нагадаем, рашэнне аб індэксацыі некаторых тарыфаў прынята згодна з указам Прэзідэнта, які ўступіў у сілу сёлета з 1 студзеня. Дакумент дае механізм змены тарыфаў, які прывязаны да тэмпаў росту намінальнай заработнай платы. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс змены тэмпаў росту намінальнай заработнай платы склаў 9,8%. Пры гэтым праіндэксаваныя толькі тыя тарыфы, што субсідзіруюцца, — гэта значыць, тыя, якія не дасягнулі 100-працэнтнага ўзроўню кампенсацыі выдаткаў.

Так, тарыф на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з 82 020 рублёў за 1 Гкал вырасце да 90 058 рублёў. Кошт аднаго кубаметра прыроднага газу ў ацяпляльны перыяд пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў павышаецца з 530,3 да 582,2 рублёў, а звадкаваны газ даражэе з 8 215,9 да 9 021 рубля за куб. м. Аднастаўкавачны тарыф на электрычную энергію ў жылых дамах (кватэрах), абсталяваных электраплітамі, з 1 верасня, згодна з пастановай, вырасце з 633,9 да 696 рублёў за 1 кВт/гадз. Дыферэнцыраваны тарыф па часавых перыядах павялічыцца: з 443,7 рублёў да 487,1 за 1 кВт/гадз (з 22.00 да 17.00 — перыяд мінімальных нагрузак); з 1 267,8 рубля да 1 392 за 1 кВт/гадз (з 17.00 да 22.00 — перыяд максімальных нагрузак).

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

■ Нагода для гонару

## КРАІНА 100-ПРАЦЭНТНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

**Беларусь займае чацвёртае месца ў свеце па колькасці тых, хто атрымлівае сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю і адукацыю пасля ВНУ на 10 тысяч жыхароў (641 чалавек).**

Такія даныя ЮНЕСКА прыводзіць Нацыянальны статыстычны камітэт, паведамляе БЕЛТА. Па гэтым паказчыку наша краіна ўступае толькі Рэспубліцы Карэя (699 чалавек), ЗША (683 чалавекі), Чылі (657 чалавек) і апярэджвае такія развітыя дзяржавы, як Фінляндыя (592 чалавекі), Швецыя (496 чалавек), Нарвегія (495 чалавек), Аўстрыя (461 чалавек), Францыя (374 чалавекі).

■ Дзяржаўны інтарэс

## ДАКЛАДНА ПА ГРАФІКУ

**Узвядзенне Беларускай атамнай электрастанцыі перайшло ў надземную стадыю будаўніцтва.**

На энергаблоку №1 БелАЭС змантіраваны 1-ы блок унутранай ахоўнай абалонкі. «Гэтая падзея па значнасці параўнальная з заліваннем «першага бетону». Мантаж унутранай ахоўнай абалонкі — адзін з вузлавых момантаў будаўніцтва. Тым самым мы выйшлі на мантаж надземнай часткі станцыі», — цытуе БЕЛТА генеральнага дырэктара РУП «Беларуская АЭС» Міхаіла Філімонава.

Як падкрэсліў Міхаіл Філімонаў, мантаж першага блока ўнутранай ахоўнай абалонкі выкананы дакладна па графіку.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Славакія пачынае рэверсныя пастаўкі газу ва Украіну



Учора са Славакіі ва Украіну пачаліся камерцыйныя пастаўкі газу ў рэверсным рэжыме па рэканструяваным трубаправодзе «Ваяны—Ужгарад». Пра гэта паведаміў прадстаўнік аператара газатранспартнай сістэмы Славакіі — кампаніі Eustream Ваграм Чугуран. Паводле яго слоў, афіцыйны старт камерцыйных паставак газу ва Украіну ў рэверсным рэжыме быў дадзены 2 верасня. Таксама паведамляецца, што запланаваны аб'ём паставак газу — 27 млн кубаметраў газу ў суткі, або каля 10 млрд у год. Кошт газу па рэверсіўных пастаўках са Славакіі — $360 за 1 тыс. кубаметраў.

### Ідэнтыфікаваны 183 ахвяры катастрофы малайзійскага «Боінга»

Целы 183 загінулых у катастрофе малайзійскага «Боінга 777» у Данецкай вобласці ўжо апазнаны. Пра гэта паведамляе прэс-служба ААН. «Боінг 777» авіякампаніі Malaysia Airlines, які рухаўся рэйсам Амстэрдам (Нідэрланды) — Куала-Лумпур (Малайзія), пацярпеў крушэнне 17 ліпеня ў Данецкай вобласці Украіны. Загінулі 283 пасажыры і 15 членаў экіпажа.

### Кіраўнік дыпламатыі ЕС паведаміла пра новыя санкцыі

Экс-кіраўнік МЗС Італіі Федэрыка Магерыні, прызначаная на мінулых выхадных вярхоўным прадстаўніком Еўрапейскага саюза па замежных справах і палітыцы бяспекі, заявіла, што эканамічны блок прыме рашэнне наконт новых санкцый у дачыненні да Расійскай Федэрацыі да пятніцы, 5 верасня. Новы пакет санкцый будзе ўключаць у сябе абмежавальныя меры ў чатырох сферах. У іх ліку — абарона, тавары двайнога прызначэння і фінансы. Раней паведамлялася, што, у прыватнасці, улады Вялікабрытаніі збіраюцца прапанаваць ЕС разгледзець магчымасць заблакіраваць Расіі доступ да банкаўскай сістэмы SWIFT. Адзначым, што напярэдадні ў інтэрв'ю выданню «Corriere della Sera» дыпламат заявіла, што «Расія цяпер больш не з'яўляецца стратэгічным партнёрам» Еўрасаюза.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

#### Садавіна — універсальная абарона ад інсультаў і сардэчных прыступаў

Усяго 1-2 кавалачкі садавіны ў дзень дастаткова, каб знізіць рызыку сардэчнага прыступу або інсульту да 40%. Пра гэта кажуць навукоўцы з Оксфардскага ўніверсітэта, якія даследавалі амаль 500 тыс. чалавек на працягу сямі гадоў. Аказалася, людзі, якія ўключалі ў свой рацыён садавіну кожны дзень, радзей сутыкаліся з хваробамі сэрца і двума тыпамі інсультаў. Спажыванне садавіны характарызавалася па пяці катэгорыях: «ніколі», «штомесяц», «1-3 разы на тыдзень», «4-6 разоў у тыдзень», «кожны дзень». Так, чым часцей людзі елі садавіну, тым ніжэй была рызыка ўскладненняў. У параўнанні з людзьмі, якія наогул не ўжывалі садавіны, у тых, хто з'ядаў па фрукце кожны дзень, паказчыкі сардэчна-сасудзістых хвароб былі зніжаны на 15%. Паказчыкі ішэмічнага інсульту памяншаліся на 25%, а гемарагічнага інсульту — на 40%. Акрамя таго, у аматараў садавіны быў значна зніжаны сісталічны ціск (на 3,4 міліметра ртутнага слупка) і дыясталічны (на 4,1 міліметра), піша The Telegraph.

### КОРАТКА

Паток турыстаў у Беларусь у І паўгоддзі 2014 года павялічыўся на 25%.

**Міністэрства фінансаў Беларусі з красавіка па верасень шляхам прамога продажу праз Беларускую валютна-фондавую біржу размясціла дзяржаўных валютных аблігацый выпускаў №№ 123, 124, 126, 128 для юрыдычных асоб на $90,1 млн і 13,7 млн еўра.**

З пачатку года ў РНПЦ «Кардыялогія» праведзена 30 трансплантацый сэрца.

**Вікторыя Азаранка прайшла ў чвэрцьфінал адкрытага чэмпіянату ЗША, атрымаўшы перамогу над 17-гадовай Аляксандрай Круніч — 4:6, 6:4, 6:4.**

Мінлясгас Беларусі накіруе на развіццё сістэмы відэаназірання ў лясным фондзе Br10 млрд, паведаміў першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік. Дапамогу на развіццё сістэмы відэаназірання выдзяляе дзяржава.

**Беларусь увяла часовыя абмежаванні на ўвоз свініны з Чарнігаўскай вобласці Украіны з-за АЧС.**

■ Сацыяльная падтрымка

## ПРАЦА І СЯМЕЙНЫЯ АБАВЯЗКІ

### Пашырана кола работнікаў, якія маюць права на свабодны аплачваемы дзень у тыдзень



Фота БЕЛТА.

**Права на свабодны аплачваемы дзень у тыдзень работнікам, якія выхоўваюць дзяцей, — адна з мер дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі па падтрымцы шматдзетных сем'яў і сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Яна вельмі важная для іх, паколькі дазваляе гарманічна спалучаць працу з сямейнымі абавязкамі. Новай рэдакцыяй Працоўнага кодэкса краіны, які ўступіў у сілу 25 ліпеня, паўнамоцтвы па рэгламентаванні прадастаўлення такога дня дадзены Міністэрству працы і сацыяльнай абароны. Прынята пастанова Мінпрацы і сацабароны № 34, якой зацверджана Інструкцыя аб парадку і ўмовах прадастаўлення аднаго дадатковага свабоднага ад работы дня ў тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку. Аб асноўных навацыях у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА паведаміла намеснік <u>начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.</u>**

— Інструкцыя распрацавана ў развіццё ч.2 арт. 265 Працоўнага кодэкса, што ўстанаўлівае гарантыі па прадастаўленні аднаго дадатковага свабоднага ад работы дня ў тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку маці (мачысе) ці бацьку (айчыму), апекуну (папячыцелю), якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў альбо траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў.

СТАР. 2

■ Парламент маладых

# СТАЦЬ ДЭПУТАТАМ МОЖНА І Ў ШКОЛЕ

## Анатоль Рубінаў сустрэўся з прадстаўнікамі Маладзёжнай палаты пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў

**Студэнт першага курса Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Ягор МАКАРЭВІЧ лічыць, што сёння думаць пра кар'еру сенатара яму яшчэ рана — трэба вучыцца. Пакуль жа хлопец з'яўляецца старшынёй Маладзёжнай палаты чацвёртага склікання пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў.**

Гэты орган быў створаны ў 2007 годзе для таго, каб дэпутаты даведваліся аб праблемах моладзі і пра тое, чым яна цікавіцца, непасрэдна «з першых рук». Ягор і 56 яго калег, маладых парламентарыяў, планавалі сваю перадвыбарную кампанію, прэзентавалі праграмы выбаршчыкам, збіралі подпісы... Радуе, што пра маладых не забываюцца дарослыя калегі. Якраз на днях **Анатоль РУБІНАЎ, старшыня Савета Рэспублікі**, правёў для юных дэпутатаў гасцявы ўрок.

### МАЛАДЗЁЖНЫЯ ПАРЛАМЕНТЫ МОГУЦЬ З'ЯВІЦЦА І Ў АБЛАСЦЯХ

Нягледзячы на тое, што Маладзёжная палата пакуль што працуе толькі ў сталіцы, гэты кансультатыўны орган мае аўтарытэт і ў агульнарэспубліканскім маштабе. Анатоль Рубінаў не выключае, што падобныя структуры з'явяцца і ў абласцях Беларусі.

— Маладзёжны парламент, створаны ў Мінску, апраўдвае сябе. Ён не толькі займаецца пытаннямі, якія цікавяць моладзь сталіцы, але і можа непасрэдна паўплываць на тое, каб былі прыняты тыя ці іншыя рашэнні.

Па словах старшыні Савета Рэспублікі, калі ў абласцях наспела неабходнасць стварэння падобных палат і ёсць моладзь, якая хоча і гатова гэтым займацца, а таксама наладжана ўзаемадзеянне з абласнымі Саветамі дэпутатаў, то такая структура можа быць створана.

Што да фарміравання Маладзёжнай палаты пры Нацыянальным сходзе, то сёння такой неабходнасці няма.

— Часам узнікае ілюзія, што для вырашэння праблемы трэба стварыць новыя структуры, формы або даць іншую назву... На самой справе галоўнае — якасць працы і яе змястоўнасць. Калі, вядома, недзе праяўляецца ініцыятыва, то гэта нядрэнна, бо такім чынам моладзь атрымлівае магчымасць праявіць сябе ў новай якасці. На рэспубліканскім узроўні мы не бачым сёння такой неабходнасці, і не зусім зразумела, чым такі парламент будзе займацца.

### ГАЛОЎНАЕ — НЕАБЫЯКАВАСЦЬ

Выступаючы перад маладымі парламентарыямі, кіраўнік Савета Рэспублікі з удзячнасцю адзначыў зацікаўленасць хлопцаў і дзяўчат жыццём грамадства, яго праблемамі.

— Вы неабыякавыя і стараецеся палепшыць наша жыццё. Да таго ж у вас нядрэнна ідзе праца. За кароткі тэрмін вы дасягнулі пэўных поспехаў і ўнеслі шмат карысных прапаноў па паляпшэнні грамадзянска-прававога выхавання моладзі, развіцці дзіцячага і юнацкага спорту. Вельмі добра, што вы імкняцеся на месцах што-небудзь палепшыць (у прыватнасці, стварыць больш цікавыя ўмовы для маладзёжнай дзейнасці).

Таксама ён звярнуў увагу маладых парламентарыяў на пытанні аб стаўленні чалавека да грамадства, аб правах і абавязках грамадзян, прыватнай і дзяржаўнай уласнасці, структуры эканомікі Беларусі, а таксама аб мадэрнізацыі прадпрыемстваў і прыцягненні інвестыцый у розныя галіны эканомікі.

### ЯКІЯ ЯНЫ, МАЛАДЫЯ ДЭПУТАТЫ?

Маладыя дэпутаты — цікавыя суразмоўцы. З аднаго боку, яны сур'ёзна ставяцца да сваёй дзейнасці ў Маладзёжнай палаце, з іншага — не робяць гэта нудным абавязкам. Такая праца для іх, хутчэй, асалода.

Структура Маладзёжнай палаты вельмі падобна да структуры парламента: ёсць старшыня і яго намеснікі, усе члены размеркаваны па 5 камісіях, якія ахопліваюць асноўныя кірункі жыцця маладых хлопцаў і дзяўчат. Так, ёсць камісіі па адукацыі і прафарыентацыі моладзі, па прапагандзе здаровага ладу жыцця, папулярызацыі фізічнай культуры і спорту ў маладзёжным асяродку, па пытаннях экалогіі і развіцця валанцёрскага руху, па грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі і прафілактыцы правапарушэнняў сярод моладзі; ёсць камісія і па арганізацыі вольнага часу.

Мой суразмоўца Ягор Макарэвіч расказаў, што няхай зараз ён і старшыня Маладзёжнай палаты, у свой час для таго, каб проста стаць яе дэпутатам, прыйшлося як след пастарацца.

— Я балатаваўся ў дэпутаты Маладзёжнай палаты трэцяга склікання, але, на жаль, тады не атрымалася. «Конкурс» у гэтую структуру складае 5-6 чалавек на адзін мандат — як у нашых вядучых ВНУ.



Фота БЕЛТА.

Але сам удзел у выбарчай кампаніі даў хлопцу неабходны вопыт, каб у 2014 годзе нарэшце стаць дэпутатам Маладзёжнай палаты ўжо чацвёртага склікання.

— Я актыўна рыхтаваўся два гады: назіраў за тым, чым займаецца Маладзёжная палата, вывучаў асновы яе працы, прадумаў сваю выбарчую праграму.

Сёння стаць кандыдатам у члены Маладзёжнага парламента можна пачынаючы з дзявятага класа школы або гімназіі і заканчваючы трэцім курсам вышэйшай навучальнай установы. Ім можа стаць любы жыхар горада Мінска адпаведнага ўзросту або студэнт ВНУ ці сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы.

Што да крытэрыяў, то, як паведаміў Ягор, на выбарах чацвёртага склікання яны былі наступнымі: кожны, хто жадаў стаць членам Маладзёжнай палаты, павінен быў падрыхтаваць тры акцыі. Перш за ўсё гэта наведванне неабароненай групы насельніцтва (прадумаць пэўны праект). Таксама трэба было арганізаваць працоўную акцыю — напрыклад, па прыбіранні тэрыторыі. Апошняя акцыя — па зборы подпісаў (неабходна сабраць не менш за 100). Пасля гэтага кандыдат рэгістраваўся на сайце Маладзёжнай палаты і праводзілася галасаванне.

**Дар'я ЛЕБЕДЗЕВА, прэс-сакратар Маладзёжнай палаты**, навучэнка 11 класа мінскай гімназіі № 5, не выключае, што вопыт удзелу ў гэтай структуры дапаможа ёй у будучыні стаць сапраўдным дэпутатам.

— Чаму б і не? Гэта цікавы і нестандартны від працы. Але раней хачу атрымаць юрыдычную ці эканамічную адукацыю. Пакуль жа ўдзел у маладзёжным парламенце мяне задавальняе. Калі былі выбары, я стала адной з першых, хто падаў заяўку. А паколькі я аказалася лепшай з маёй акругі, мяне выбралі ў Маладзёжную палату.

Калега і цёзка прэс-сакратара маладзёжнага парламента **Дар'я ЯНКОЎСКАЯ вучыцца ў 206-й сталічнай школе**. Дзяўчына цікавіцца палітыкай, стараецца ўдзельнічаць у грамадскім жыцці.

— Перамагчы ў выбарах было вельмі складана, але сам працэс — вельмі цікавы. Зараз мне падабаецца займацца справамі Маладзёжнай палаты, я ўваходжу ў камісію па экалогіі. Хутка ў нас будзе праходзіць акцыя па дапамозе жывёлам у прытулку на Гурскага... У будучым хачу паступаць у тэатральны. Тым не менш, мне будзе цікава займацца ў Маладзёжнай палаце і надалей. Калі будуць наступныя выбары, я, як і многія мае калегі, хачу зноў прыняць удзел у выбарчай кампаніі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# ...І СЯМЕЙНЫЯ АБАВЯЗКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры захаванні ранейшых асноўных падыходаў уведзены і новыя нормы, якія рэгулююць і якія канкрэтызуюць парадак і ўмовы прадастаўлення свабоднага дня ў тыдзень з улікам практыкі прымянення.

**— Кола асоб, якім прадастаўляецца свабодны ад працы дзень, пашыраны. Каму дадаткова прадастаўлена гэтая магчымасць?**

— Права на свабодны дзень у тыдзень прадастаўлена не толькі маці, бацьку, апекуну (папячыцелю), як было раней, але таксама мачысе і айчыму.

Варта адзначыць, што пры вызначэнні права шматдзетных сем'яў на большасць прававых гарантый разглядаецца фактычны склад сям'і (напрыклад, дыферэнцыяцыя памераў дапамог у сувязі з нараджэннем дзіцяці і дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, выдзяленне ільготнага крэдыту пры будаўніцтве жылля і іншае). Такі ж падыход ужыты і да гэтай прававой нормы.

**— Пры якіх умовах работнік можа разлічваць на вольны дзень?**

— У цэлым захаваны ранейшыя ўмовы, аднак ёсць і некаторыя змены.

Першая ўмова прадастаўлення свабоднага дня — калі ў сям'і работніка выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў альбо трое і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў. Другое — калі работнік у гэтым рабочым тыдні заняты пяць ці шэсць рабочых дзён з працягласцю працоўнага часу ў тыдзень не менш за 40 гадзін (ці яго скарочанай норме ў адпаведнасці з арт. 113-114 ПК). Трэцяе — калі другі з бацькоў (маці або мачаха, бацька ці айчым) у поўнай сям'і з'яўляецца занятым альбо праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме, прызнаны інвалідам, атрымлівае штомесячную страхавую выплату ў адпаведнасці з заканадаўствам аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафзахворванняў.

**— Хацелася б спыніцца падрабязней на некаторых нюансах першай умовы, паколькі ўзнікае нямала пытанняў з нагоды таго, як улічваць дзяцей, кажучы бюракратычнай мовай.**

— Калі дзеці (адзін з траіх дзяцей) знаходзяцца ў дзіцячых інтэрнатных установах або навучаюцца ва ўстановах адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання, то ў складзе сям'і яны, як і раней, не ўлічваюцца. Аднак яны ўлічваюцца ў выпадку прыбыцця ў сям'ю на тэрмін не менш за адзін каляндарны тыдзень. Напрыклад, у складзе сям'і не ўлічваюцца дзеці, якія наведваюць кругласутачныя групы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, і дзеці, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі сілавых ведамстваў або школах алімпійскага рэзерву.

Да дзяцей, якія выхоўваюцца ў сям'і, таксама не адносяцца непаўналетнія, якія набылі дзеяздольнасць у поўным аб'ёме (у выпадку ўступлення ў шлюб, напрыклад).

Пасынкі і падчарыцы ўлічваюцца ў складзе той сям'і, у якой яны выхоўваюцца.

Для апекуноў (папячыцеляў) удакладнена, што свабодны дзень у тыдзень ім прадастаўляецца, калі апека (папячыцельства) устаноўлена над дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў або над трыма і больш дзецьмі ва ўзросце да 16 гадоў.

**— Раней умовай прадастаўлення свабоднага дня была штодзённая занятасць на працы на працягу пяці (шасці) працоўных дзён.**

— Падыходы да занятасці работніка змененыя. Умова штодзённай занятасці на працягу пяці (шасці) працоўных дзён у тыдзень цяпер не ўжываецца. Свабодны дзень у тыдзень прадастаўляецца пры ўмове занятасці на працягу пяці або шасці рабочых дзён у тыдзень незалежна ад таго, на якія дні прыпадаюць дні адпачынку (на выхадныя або будныя дні) і ад рэжыму працы (з нармальнай працягласцю працоўнага часу або з падсумаваных улікам працоўнага часу). Прапанаваныя змены ўраўноўваюць у правах усіх працуючых і гарантуюць ім права на дадатковы выхадны для вырашэння пытанняў, звязаных з выхаваннем дзяцей.

Дадаткова вызначана, што працоўны тыдзень разглядаецца ў межах каляндарнага тыдня (з панядзелка па нядзелю ўключна), а працоўны дзень — у межах сутак (ад 0 да 24 гадзін уключна). У тыднёвую працягласць працоўнага часу ўключаецца працягласць вольнага дня, які прадастаўляецца ў гэты тыдзень. Гэта значыць, працоўныя дні ўлічваюцца па-за залежнасцю ад працы ў дзённы ці начны час, у будныя або выхадныя дні, а выкананне ўмовы занятасці на працягу пяці або шасці рабочых дзён вызначаецца з улікам вольнага дня, які прадастаўляецца ў гэты тыдзень.

Для прадастаўлення свабоднага дня ў тыдзень аднаму з бацькоў у поўнай сям'і патрабуецца ўмова занятасці другога з бацькоў. Калі другі з бацькоў з'яўляецца інвалідам, умова занятасці да яго не ўжываецца незалежна ад выгляду атрыманай ім пенсіі (можа быць як па інваліднасці, так і па ўзросце, па страце карміцеля і інш.). Раней такая норма распаўсюджвалася толькі на атрымальнікаў пенсіі па інваліднасці.

Зыходзячы з інтарэсаў наймальнікаў, свабодны дзень у тыдзень не прадастаўляецца, калі работнік не заняты непасрэдна на працы пяць ці шэсць рабочых дзён незалежна ад прычын і мэт яго адсутнасці. Гэта азначае, што калі працаўнік на гэтым тыдні, напрыклад, праходзіць медыцынскі агляд, накіраваны на курсы павышэння кваліфікацыі, свабодны дзень на гэтым тыдні прадастаўляцца не павінен.

**— А што тычыцца надомнікаў?**

— Уведзена норма аб непрадастаўленні вольнага дня ў тыдзень асобам, якія выконваюць працу на даму.

**— Ці абавязаны работнік паведамляць наймальніку пра надыход абставін, якія цягнуць за сабой спыненне яго права на свабодны дзень?**

— Так, такі абавязак уведзены, устаноўлены і тэрмін — пяць дзён з дня надыходу такіх абавязацельстваў. Акрамя таго, устаноўлена адзіная форма заявы, у якой заяўнік інфармуецца пра свае абавязацельствы.

Варта адзначыць, што пастановай № 34 таксама зацверджана Інструкцыя аб парадку і ўмовах прадастаўлення аднаго дадатковага свабоднага ад работы дня ў месяц з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Гэты дзень прадастаўляецца маці (мачысе) ці бацьку (айчыму), апекуну (папячыцелю), якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Раней парадак прадастаўлення такога дня не быў рэгламентаваны.

■ Падзея

# СВЯТА АД ДАР'І

## ТРОХРАЗОВАЯ АЛІМПІЙСКАЯ ЧЭМПІЁНКА ДАР'Я ДОМРАЧАВА 13 ВЕРАСНЯ ПРАВЯДЗЕ СПАРТЫЎНАЕ СВЯТА ДЛЯ ЖЫХАРОЎ І ГАСЦЕЙ СТАЛІЦЫ

**Праект «Гарадскі біятлон», прымеркаваны да Дня горада Мінска, пройдзе ў парку імя Горкага. Кожную гадзіну, пачынаючы з апоўдня, у Цэнтральным дзіцячым парку будзе стартаваць эстафета, у якой зможа прыняць удзел любы ахвотны (з тых, хто прайшоў папярэднюю рэгістрацыю). Удзельнікі павінны прабегчы тры кругі па 400 м і справіцца з двума агнявымі рубяжамі са становішча стоячы. Акрамя гэтага, у праграме фестывалю — ёга, бадмінтон, фрысбі, пінг-понг, велапаркоўка і добрая музыка. Для самых маленькіх наведвальнікаў свята прадугледжаны асаблівыя заданні і падарункі. Для дзяцей будуць арганізаваны атракцыёны, біятлонныя «размалёўкі», гульні, цір, адукацыйныя прынты і разнастайныя спаборніцтвы. Сама Дар'я ў гэты дзень выступіць у ролі актыўнай балельшчыцы і каментатара. Плануецца, што свята будзе доўжыцца больш за 6 гадзін.**



Фота БЕЛТА.

Учора наша чэмпіёнка падзялілася іншымі падрабязнасцямі праекта «Гарадскі біятлон».

**— Як прыйшла ідэя правядзення біятлонных спаборніцтваў у Мінску з удзелам усіх ахвотных?**

— Пасля такога ўдалага сезона ўвага балельшчыкаў да мяне вырасла. Зразумела, што кожнаму фізічна немагчыма надаць увагу і адказаць на кожнае паведамленне. І да мяне прыйшла ідэя арганізаваць мерапрыемства як пасланне тым людзям, якія сапраўды любяць біятлон. Падарыць ім спартыўнае свята, свята для ўсёй сям'і. Важна, што прыняць удзел у ім змогуць усе ахвотныя, бо біятлон — досыць спецыфічны від спорту, яго нельга адчуць на сабе, проста выйшаўшы на двор з мячом. Мне захацелася зрабіць такі своеасаблівы падарунак і даць шанц гараджанам паспрабаваць сябе ў гэтым выдатным відзе спорту. Я спадзяюся, што ў нас усё атрымаецца, а свята будзе вясёлым, запамінальным і цікавым. Хачу адзначыць, што гэта толькі першая, пробная акцыя. Хочацца, вядома, развіваць гэтую ідэю і далей.

**— Вы казалі пра спецыфіку віду спорту. Зразумела, што гэта стральба і бег на лыжах. Як будзе гэта рэалізавана ў фармаце мерапрыемства?**

— Пачатак мерапрыемства мы плануем у 12.00 з запускам эстафет на працягу кожнай гадзіны. Эстафеты будуць і дарослымі, і дзіцячымі, і сямейнымі. Рэалізавана гэта будзе ў выглядзе кросу са стральбой, таму што выпускаць людзей на лыжаролерах было б дастаткова небяспечна.

**— Як праходзіць рэгістрацыя?**

— Рэгістрацыя ідзе досыць актыўна, і засталося мала вольных месцаў у дарослыя эстафеты. Прычым у мужчынскія няма зусім. У падлеткавыя эстафеты пару месцаў яшчэ ёсць, але рэгістрацыя ў сямейную эстафету праходзіць даволі павольна. Таму заклікаю гараджан і ўсіх жыхароў Беларусі матываваць сям'ю на правядзенне актыўнага выхаднога. Таму што сям'я — гэта душэўная цеплыня ў доме. Давайце ўдзельнічаць больш актыўна!

**— А вы прымеце ўдзел у мерапрыемстве?**

— Так, вядома. У першую чаргу буду ўзнагароджваць пераможцаў і прызёраў. Акрамя таго, наведаю кожную зону. Будзе на мерапрыемстве таксама і ўся біятлонная каманда. Мы яшчэ падумаем над тым, як канкрэтна прыняць удзел у мерапрыемстве. Можа, нават на старт адной з гонак выйдзем.

**— Прэміяльныя будуць?**

— Прэміяльныя ў якасці грашовых прызоў уручацца не будуць. Будуць добрыя падарункі ад кампаній-спонсараў.

**— Пасля феерычнага мінулага сезона вы ўносілі змены ў падрыхтоўку?**

— Міжсезонне яшчэ ў самым разгары. Цяпер мы праводзім час у рэканструяваных Раўбічах. Умовы там створаны неблагія. Што тычыцца падрыхтоўкі, у нашай камандзе новы трэнер — Альфрэд Эдэр. З пачатку сезона мы працуем разам. План падрыхтоўкі ад ранейшых не вельмі адрозніваецца. Але некаторыя зборы я імкнуся праводзіць індывідуальна. Працуецца з аўстрыйскім спецыялістам добра. Яму падабаецца наша каманда. Ён адказвае за падрыхтоўку жаночай паловы, а мужчынскую пры неабходнасці кансультуе. Як паўстаў саюз? Вы ведаеце, што Клаус Зіберт не працягнуў супрацоўніцтва па стане здароўя. Паўстала неабходнасць у вопытным чалавеку. Думаю, Эдэр цалкам падыходзіць на гэтую ролю. І ён прыжыўся ў камандзе. Усе спартсмены выдатна да яго ставяцца. Што тычыцца Зіберта, то ўсіх падрабязнасцяў, зразумела, не ведаю. Аднак ён праходзіць курс рэабілітацыі. Тэлефанавала яму, чула бадзёры голас. Вось, матацыкл сабе купіў.

**— А якая роля Адрыяна Цыбульскага?**

— Адрыян Аляксеевіч займаецца пераважна арганізацыйнымі момантамі. Наогул, лепш гэтае пытанне задаць яму самому. У трэніровачным працэсе большы ўдзел прымае Эдэр. Тым не менш Цыбульскі працягвае заставацца маім асабістым трэнерам.

**— Многія спартсмены бяруць паўзу пасля алімпійскіх сезонаў. Ці не было ў вас такой думкі?**

— У адпачынак не пайшла, паўзы не брала. У мяне дастаткова матывацыі на маючы адбыцца сезон. Спадзяюся, усё добра складзецца з падрыхтоўкай і сезон будзе ўдалым. Медалі я з сабой на трэніроўкі і гонкі не бяру. Яны былі ўчора, таму мяне не абцяжарваюць і ніяк не перашкаджаюць. Галоўнае — граматна расставіць прыярытэты.

**— Ці будуць у наступным сезоне новыя асобы ў зборнай?**

— Адборачныя старты пакажуць. З намі займаецца малады састаў. Ёсць перспектыўныя дзяўчынкі-юніёры. Вельмі спадзяюся на іх.

**— У якім стане, на ваш погляд, цяпер Раўбічы?**

— Яшчэ вядзецца вялікая колькасць будаўнічых работ. Скончана толькі траса. Зрэшты, мяркую, будаўнікі справяцца. Мэта — зрабіць Раўбічы адным з лепшых біятлонных комплексаў, каб там праводзіліся міжнародныя спаборніцтвы.

**— Асацыяцыя спартыўнай прэсы вылучыла вас на званне лепшай спартсменкі года. Згодны з такім прызнаннем і каго б маглі назваць у якасці альтэрнатывы?**

— Я канцэнтрыруюся толькі на сваёй працы, не адхіляючыся ад гэтага працэсу. Мінулы сезон — гэта і ёсць мінулае. На яго не азіраюся. А што тычыцца фаварыткі... У мяне яе няма.

**— Што змянілася пасля Алімпіяды ў Сочы? Адчуваеце сябе вялікай спартсменкай?**

— Перш за ўсё, стала значна менш вольнага часу. Вось, мабыць, і ўсё.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■

■ Супрацоўніцтва

# КАМІТЭТ ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРАЎ

**Заўтра ў Пекіне адбудзецца першае сумеснае пасяджэнне Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве. Як паведамляе прэс-служба Міністэрства замежных спраў Беларусі, плануецца падпісанне пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Кітайскай Народнай Рэспублікі аб стварэнні Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве, а таксама пратакол першага пасяджэння камітэта.**

На ўстановачным пасяджэнні камітэта ў Пекіне будуць сустаршынстваваць намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Тозік і член Палітбюро ЦК Камуністычнай партыі Кітая, сакратар палітыка-юрыдычнай камісіі ЦК КПК Мэн Цзяньчжу (па інфармацыі МЗС, яго пасада адпавядае ўзроўню віцэ-прэм'ера дзяржсавета).

Камітэт — новы механізм каардынацыі двухбаковых адносін на ўзроўні віцэ-прэм'ераў, які ствараецца ў мэтах далейшага ўмацавання і развіцця ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж дзвюма краінамі на аснове дамоўленасцяў, дасягнутых кіраўнікамі дзяржаў і ўрадаў Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі ў 2013-2014 гг.

У склад камітэта ўвойдуць пяць камісій: дзве камісіі па гандлёва-эканамічным і па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, якія дзейнічалі і раней, а таксама тры зноў створаныя камісіі ў галіне адукацыі, культуры і бяспекі.

Па выніках мінулага года сумесны тавараабарот Беларусі і Кітая перавысіў 3 мільярды долараў. Эканамічныя стасункі Беларусі з гэтай краінай трымаюцца не толькі на гандлі, але і ў значнай ступені на вытворчай кааперацыі — рабоце сумесных вытворчасцяў і прадпрыемстваў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

■ Факт

# НОВЫ РАЎНД БУДЗЕ

**Перагаворы трохбаковай кантактнай групы (Украіна—Расія—АБСЕ) па ўрэгуляванні сітуацыі на ўсходзе Украіны будуць працягнуты 5 верасня.**

Кансультацыі па ўкраінскім пытанні працягваліся каля чатырох гадзін. Наступны раўнд перагавораў адбудзецца ў Мінску 5 верасня.

Удзел у перагаворах прынялі экс-прэзідэнт Украіны Леанід Кучма, пасол Расіі ва Украіне Міхаіл Зурабаў, афіцыйны прадстаўнік дзейнага старшыні АБСЕ па пытаннях урэгулявання сітуацыі ва Украіне Адэльхейд Тальявіні. Інтарэсы апалчэння ў Мінску прадстаўляў віцэ-прэм'ер самаабвешчанай Данецкай народнай рэспублікі Андрэй Пургін.

**Кар. БЕЛТА**

■

# П'ЕШ ПІВА З ПАДЛЕТКАМ? БУДЗЕШ НЕСЦІ АДКАЗНАСЦЬ...

**Міністэрства ўнутраных спраў прапануе зрабіць больш жорсткай адказнасць юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за продаж алкаголю дзецям аж да пазбаўлення індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы права займацца пэўнай дзейнасцю. Аб гэтым паведаміў журналістам начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Беларусі Віталь ЯНЧЫН.**

— Нярэдка падлеткі здзяйсняюць правапарушэнні, трапіўшы пад уплыў дарослых. Напрыклад, сёння нельга прыцягнуць да крымінальнай адказнасці дарослага чалавека, які пастаянна распівае піва з непаўналетнім, уцягваючы такім чынам падлетка ў п'янства, — патлумачыў Віктар Янчын. — У гэтай сувязі Міністэрства ўнутраных спраў выступіла з ініцыятывай аптымізаваць крымінальную адказнасць за ўцягненне падлеткаў у антыграмадскія паводзіны. Міністэрствам быў распрацаваны дакумент, уключаны ў праект плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2015 год.

Акрамя таго вышэйзгаданым міністэрствам, а таксама міністэрствамі адукацыі і аховы здароўя зараз распрацоўваецца комплекс мер па папярэджанні распаўсюджвання алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў сярод школьнікаў і моладзі. У прыватнасці, ужо распрацаваны парадак правядзення тэсціравання і псіхасацыяльнага анкетавання навучэнцаў і студэнтаў на прадмет спажывання імі алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў.

Як запэўніла **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Інэса КІСЛАЯ**, анкетаванне і тэсціраванне — справа добраахвотная:

— У адпаведнасці з Законам «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі» мы не можам прымусіць падлеткаў праходзіць гэтыя працэдуры без дазволу іх бацькоў. Але спадзяёмся на іх разуменне ў гэтым пытанні. Спачатку ва ўстанове адукацыі навучэнцам будзе прапанавана паўдзельнічаць у псіхасацыяльным анкетаванні. І ўжо па яго выніках (калі будуць на тое падставы) бацькам могуць прапанаваць звярнуцца разам з дзіцем у профільныя ўстановы аховы здароўя, дзе будзе праводзіцца ўжо наркалагічнае тэсціраванне.

Яшчэ адно новаўвядзенне тычыцца педагогаў. Не сакрэт, што раней, калі ва ўстанове адукацыі выяўляліся факты ўдзелу навучэнцаў у правапарушэннях, то педагога маглі пакараць. Напрыклад, калі педагог устанаўліваў факт спажывання яго вучнем наркатычных рэчываў або алкаголю і пачынаў біць трывогу, то мог пазбавіцца за сваю пільнасць і неабыякавасць прэміі — каб не псаваў імідж навучальнай установы і станоўчую статыстыку. А цяпер, наадварот, педагогаў, якія выявяць у сваім калектыве праблемнае дзіця ці нейкія негатыўныя з'явы, будуць заахвочваць. Як менавіта, яшчэ не вырашылі. У дакуменце гэта не канкрэтызуецца. «Магчыма, будзе прадугледжана нейкае прэміяльнае заахвочванне, — падзялілася сваім меркаваннем Інэса Кіслая. — Але добра ўжо тое, што педагогі перастануць баяцца пакарання...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРЫТУЛАК ДЛЯ КРЫЧАЎСКІХ ГІМНАЗІСТАЎ

**Навучэнцаў гімназіі, дзе абвалілася частка будынка, прынялі 4 вучэбныя ўстановы райцэнтра.**

Надзвычайная сітуацыя, якая здарылася за два дні да пачатку новага навучальнага года на Магілёўшчыне, мела рэзананс на ўсю краіну. У прыбудове гімназіі рухнулі перакрыцці, пакінуўшы ад актавай і спартыўнай залы груды друзу. На шчасце, ніхто не пацярпеў. На месцы пабывалі прадстаўнікі ўрада краіны і абласнога кіраўніцтва. Зараз тут працуюць эксперты, а школьнікам і настаўнікам — гэта больш за 600 чалавек — далі часовы прытулак іншыя навучальныя ўстановы райцэнтра. Ужо на наступны дзень пасля здарэння ў мясцовай прэсе з'явілася інфармацыя, што вучні старэйшых класаў будуць атрымліваць веды ў абласным ліцэі №4 Крычава, 5-8 класаў — у першай школе, 2-4 — у пятай, а першакласнікі — у школе №7. Як паведамілі ў райвыканкаме, вучэбны працэс арганізаваны ў 2 змены. На другую прыходзяць вучні 3,4, 6-8 класаў. Але разглядаецца магчымасць навучэнцаў пачатковай школы перавесці на першую змену. Школы знаходзяцца ў розных канцах горада, але для падвозу дзяцей аблвыканкам да 6 існуючых аўтобусаў дадаткова выдзеліў 2 новыя. На сайце аддзела адукацыі, спорту і турызму Крычаўскага райвыканкама вісіць графік руху школьнага транспарту. Прычым, графік пастаянна карэктуецца з улікам пажадання бацькоў. На Дзень ведаў райцэнтр наведала старшыня Нацбанка Надзея Ермакова, якая пабывала ў школе №5, дзе зараз вучацца таксама гімназісты 2-4 класаў, і ўручыла падарункі. Яна таксама сустрэлася з педкалектывам абласнога ліцэя.

Што датычыцца прававой адзнакі таго, што адбылося ў Крычаве, казаць яшчэ рана. Нагадаем, што Следчы камітэт па Магілёўскай вобласці распачаў крымінальную справу па факце абвальвання перакрыццяў школы па артыкуле 428 (службовая халатнасць).

— Створана камісія пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера краіны, якая займаецца гэтым пытаннем, — адзначыў **начальнік упраўлення Следчага камітэта РБ па Магілёўскай вобласці Аляксандр РАКУСАЎ**. — З месца здарэння канфіскаваны рэчавыя доказы, якія пройдуць не адну тэхнічную экспертызу. Толькі пасля гэтага можна будзе назваць прычыну разбурэння. Таму і развалы засталіся. Дзе гарантыі таго, што не разбурацца і іншыя сцены? Вядома, што ў школе перад новым навучальным годам праводзіўся рамонт і апошняе акно памянялі за некалькі дзён да здарэння.

Дарэчы, на Магілёўшчыне пасля прэцэдэнту былі аператыўна праверaны 9 школ падобнай канструкцыі. Усе яны адпавядаюць прад'яўленым ім патрабаванням. Усе 387 навучальных устаноў, акрамя крычаўскай гімназіі, працуюць у звычайным рэжыме. Як адзначыў **начальнік упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір РЫЖКОЎ**, далейшы лёс крычаўскай гімназіі — аднавіць будынак ці знесці — будзе вырашаць урадавая камісія пасля завяршэння дэталёвага абследавання і правядзення неабходных экспертыз.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

3 верасня 2014 г.
№ 13 (334)


СЕСІЯ

## СПРАВА НЕ Ў КОЛЬКАСЦІ

**Мінская вобласць вызначана пляцоўкай для правядзення эксперыменту па аптымізацыі штатных работнікаў тых ці іншых грамадскіх аб'яднанняў. Як адзначыў падчас чарговай сесіі старшыня абласнога Савета дэпутатаў Іван Ліпніцкі, магчыма, варта скараціць іх апарат да 2–3 чалавек, а астатнія маглі б прыносіць карысць у рэальным сектары эканомікі.**

**НАЧАЛЬНІК галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Руслан ТРУХАН** агучыў вынікі сацыялагічнага даследавання інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Каля паловы рэспандэнтаў (49%) давяраюць грамадскім арганізацыям і палітычным партыям, якія падтрымліваюць уладу і супрацоўнічаюць з ёй. Высокі давер, у прыватнасці, да дзейнасці аб'яднанняў «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» — 64%, «Белая Русь» — 44,6%. Арганізацыі, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, атрымалі 56,9%. Як адзначыў Руслан Трухан, з улікам таго, што гэта самая шматлікая арганізацыя, узровень ахопу насельніцтва вобласці недастатковы. 28% апытаных у той ці іншай меры давяраюць незалежным прафсаюзам. Разам з тым, 73,5% рэспандэнтаў нелаяльна ставяцца да дзейнасці апазіцыйных сіл.

Ветэранская арганізацыя — адна з самых шматлікіх: 836 «пярвічак» налічваюць 300 тыс. чалавек, а гэта чвэрць жыхароў Міншчыны. У абласным і мясцовых бюджэтах штогод прадугледжваюцца сродкі для аплаты працы, камандзіровачных расходаў, матэрыяльнай дапамогі прадстаўнікам Саветаў ветэранаў. Сёлета яны склалі, адпаведна, 100 млн і 760 млн рублёў.

Перш за ўсё, гэтая арганізацыя ставіць на мэце паляпшэнне ўмоў пражывання, абарону правоў, вырашэнне праблем пажылых людзей, у тым ліку медыцынскага і бытавога абслугоўвання, наладжванне паўнавартаснага адпачынку. На пастаянным кантролі забеспячэнне ветэранаў, інвалідаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі. Летась на гэтыя мэты выдзелена больш як 11 млрд рублёў, сёлета — звыш 15 млрд. Акрамя таго, многае робіцца для таго, каб састарэлыя не адчувалі сябе адзінокімі, а іх багаты вопыт быў запатрабаваны для выхавання маладога пакалення.

У якасці прыкладу **старшыня Мінскага абласнога каардынацыйнага Савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый Марыя ХУДАЯ** прывяла работу Ганны Чачоткінай, якая ўзначальвае ветэранскую арганізацыю Смалявіцкага раёна. Ганна Іванаўна не абыходзіць увагай усіх, хто мае патрэбу ў маральнай, матэрыяльнай падтрымцы не толькі за кошт бюджэтных сродкаў, але і за кошт спонсарскай дапамогі, унёскаў працоўных калектываў.

— У полі нашага зроку і работа з моладдзю. Менавіта падрастаючае пакаленне — адзін з галоўных кадравых рэзерваў для выканаўчых органаў улады, ідэалагічнага актыву. Яно будзе ў хуткім часе працаваць з насельніцтвам, фарміраваць грамадскую думку,— канстатавала Марыя Худая.— Акрамя таго, мы вядзём вялікую работу па прыёме грамадзян. Да нас звяртаюцца па дапамогу жыхары вобласці, і ў 70% выпадкаў мы вырашаем іх праблемы.

Паводле слоў старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Івана Ліпніцкага, неабходна актывізаваць работу з грамадскімі аб'яднаннямі і палітычнымі партыямі. У прыватнасці, Іван Ліпніцкі прапанаваў распрацаваць і рэалізаваць планы па каардынацыі іх структур з улікам сацыяльна значных падзей 2015 года. А што датычыцца моладзі — правесці ў кастрычніку сёлета і ў красавіку будучага года месячнікі па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі. Важны, на яго думку, і такі момант, як замацаванне маладых людзей на прадпрыемствах і ў арганізацыях вобласці, наладжванне сістэмы настаўніцтва, конкурсаў і спаборніцтваў «Лепшы па прафесіі», стварэнне саветаў маладога спецыяліста. І ў першую чаргу гэта датычыцца маладзёжнага саюза. А прафсаюзам Іван Ліпніцкі параіў уключаць у калектыўныя дагаворы пункты аб заахвочванні работнікаў, якія займаюцца павышэннем прафесійнага ўзроўню маладых спецыялістаў.

Удзельнікаў сесіі цікавіла і пытанне аб пераходзе БРСМ на самафінансаванне. Але па словах Руслана Трухана, пра гэта гаварыць пакуль рана: моладзь сёння не ў стане зарабляць вялікія сродкі. Разам з тым, захады да гэтага прымаюцца, у тым ліку і шляхам працоўнай занятасці, адлічэнняў ад будатрадаўскага руху. Але гэтыя заробкі не параўнальныя з затратамі маладзёжнага саюза.

***

Усяго ж у Мінскай вобласці функцыянуюць 25 грамадскіх арганізацый, у тым ліку 5 палітычных партый, 19 грамадскіх аб'яднанняў і 1 прафесійны саюз.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## «ДРОБЯЗЯЎ» НЕ БЫВАЕ

### *Як дэпутат дапамагае аднаўляць манастыр*

Надзея ЮШКЕВІЧ

**У Оршы захавалася шмат цікавых помнікаў гісторыі, сярод якіх і Куцеінскі мужчынскі манастыр, заснаваны яшчэ ў 1620 годзе. У свой час ён быў не толькі вядомым рэлігійным, але і культурна-асветніцкім цэнтрам. Менавіта там кнігадрукар і асветнік Спірыдон Собаль надрукаваў першы на тэрыторыі нашай краіны буквар. У 1930-я гады пад ціскам савецкай улады жыццё там цалкам спынілася, але пра манастыр не забылі. З канца мінулага стагоддзя і па сёння там ідуць рэстаўрацыйныя работы. Аднаўленне манастыра — адзін з наказаў выбаршчыкаў дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па Аршанскай гарадской выбарчай акрузе № 26 Людміле ДАБРЫНІНАЙ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### *На перспектыву*

— Думаю, наш выбаршчык ацэньвае працу ўлад перш за ўсё па тым, як развіваецца горад, як развіваецца сацыяльная сфера, як вырашаюцца пэўныя праблемы людзей, якія звяртаюцца па дапамогу,— расказвае Людміла Дабрыніна.— Орша — гэта старажытны горад, буйны прамысловы і чыгуначны цэнтр. Ён цікавы яшчэ і тым, што ў апошнія гады развіваецца асабліва актыўна.

Людміла Анатольеўна заўважае, што неад'емнай часткай дэпутацкіх абавязкаў з'яўляецца праца над значнымі праектамі, якія няхай і немагчыма рэалізаваць за кароткі час, але ж яны маюць для людзей асаблівае значэнне.

— Дэпутат павінен ведаць, чым жывуць выбаршчыкі, што сёння хвалюе людзей. У той жа час асабліва важна працаваць, што называецца, «на перспектыву», брацца за складаныя задачы, якія патрабуюць не аднаго года мэтанакіраванай працы.

Для Людмілы Дабрынінай такой працай стала аднаўленне Свята-Богаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра, якому летась споўнілася 390 гадоў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

УСЁ Ў ПАРАДКУ

## ЖАНОЧЫ КЛОПАТ

### *У Кобрыне працуе адзіная ў краіне жанчына — вадзіцель МАЗа*

ЛЮДМІЛА з дзяцінства любіла машыны. Не раз каталася побач з бацькам, які працаваў на вялікім грузавіку. І тое, што яна стала вадзіцелем, нікога не здзівіла. А вось кіраваць вялізным МАЗам, які штодня ачышчае горад ад бытавых адходаў, заўсёды лічылася мужчынскай справай. Але Людміла Харламава папрасіла кіраўніцтва Кобрынскага ЖКГ даць ёй шанц. І цяпер новаму супрацоўніку там не нарадуюцца.

Па-першае, яе аўтамабіль заўсёды вымыты і вычышчаны да бляску. І мужчыны, што працуюць побач, сталі крыху лепш глядзець за сваімі машынамі. З яе таксама бяруць прыклад у пытаннях запаўнення і вядзення дакументацыі. Раней у брыгадзе вадзіцеляў гэта была ледзь не галоўная праблема, вечна нехта забываў што-небудзь па справаздачнасці. А новы вадзіцель дакументы афармляе бездакорна. Калі ж Людміле спатрэбіцца якая дапамога, побач працуюць муж Дзмітрый і свёкар Уладзімір Мікалаевіч.

Ды Людміла і сама ўжо віртуозны вадзіцель, бо круціцца з габарытным цяжкавозам у цяперашніх цесных дварах, запоўненых легкавымі машынамі, нельга без асаблівых увагі, дакладнасці і каардынацыі. Яе штодзённая работа — прыбіраць родны горад, рабіць яго прыгажэйшым.

У сям'і ў Людмілы Харламавай растуць двое дзяцей. Усё яна паспявае, паўсюль у яе лад.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ

## ПАЧЫМ ДОМІК У ВЁСЦЫ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### *У Мінскай вобласці ахвотным прадастаўляюць участкі для будаўніцтва ў сельскай мясцовасці*

**Прайшоў час, калі людзі ставіліся да зямлі абыякава, лічылі яе нічыйнай. Сёння наша псіхалогія змянілася: кожны гараджанін хоча займець домік на прыродзе, асабліва ў прыгараднай зоне, каля сталіцы. Надышоў час удасканаліць механізм выдзялення зямельных участкаў, зрабіць яго празрыстым і зразумелым, выключыць магчымасць махінацый пры размеркаванні зямлі, урэгуляваць пытанні асвойвання ўчасткаў. Не сакрэт, што многія ўладальнікі гадамі не могуць завяршыць будаўніцтва. Ёсць і такія, хто, на хуткую руку ўладкаваўшы на выдзеленым надзеле «птушнік», прадае «маёмасць» за вялікія грошы. На Міншчыне ўзмацнілі кантроль за выдзяленнем зямельных участкаў як на абласным, так і на раённых узроўнях.**

На тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў Міншчыны падабрана 2600 гектараў зямлі для прыкладна 13600 участкаў. Сярод іх ёсць, так бы мовіць, нічыйная зямля: пустыркі, свабодныя плошчы, якія гадамі зарасталі бур'янам ды пустазеллем. Для іх забудовы неабходна аформіць адпаведную дакументацыю. Работа ў гэтым кірунку працягваецца, расказаў старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван Ліпніцкі.

— Мала выявіць такія ўчасткі. Сёння старшыні сельскіх Саветаў разам з землеўпарадкавальнымі службамі раёнаў робяць іх замер, вызначаюць, ці можна на гэтым месцы паставіць дом,— патлумачыў ён.

У Мінскай вобласці ў спісах на атрыманне жыллёвых участкаў значыцца 32750 чалавек, з якіх 31671 мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Але ж 21358 грамадзян з іх стаяць на чарзе на выдзяленне ўчасткаў менавіта ў Мінскім раёне. Вядома, у прысталічным рэгіёне няма столькі свабодных надзелаў, каб усіх задаволіць. Таму чаргавікам прапануюць зямлю ў раёнах, якія мяжуюць з Мінскім: Дзяржынскім, Пухавіцкім, Лагойскім, Уздзенскім, Валожынскім. Калі чалавек адмаўляецца, то яго здымаюць з чаргі.

— Мінскі раён — суцэльная «будаўнічая рана»,— канстатуе мой суразмоўца.— Куды ні кінь вокам, абавязкова ўбачыш падмуркі ці часткова забудаваныя «пятачкі». На астатняй тэрыторыі — пустазелле, беспарадак, безгаспадарчасць. І гэтае будаўніцтва цягнецца гадамі. Таму прынята рашэнне больш не выстаўляць тут пляцоўкі на аўкцыён, а даць людзям магчымасць **закончыць будаўніцтва на працягу трох гадоў.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

## СВЯТА БЕЗ СВЯТЛА, АЛЕ Ж... З ФЕЕРВЕРКАМ

**Дарожная аварыя не сапсавала настрою жыхарам асіповіцкай вёскі Радуцічы, якая адсвяткавала свой 465-ы дзень нараджэння. Быў пашкоджаны слуп лініі электраперадач, і вёска цалкам засталася без святла. Але старшыня Дараганаўскага сельскага Савета Тамара Валадзько паклапацілася пра тое, каб у сельскі клуб, дзе адбыліся асноўныя мерапрыемствы, прывезлі генератар.**

— Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло,— смяецца Тамара Юльянаўна.— Людзей, як ніколі, сабралася шмат. А што рабіць дома, калі электрычнасці няма? Нават тэлевізар не паглядзіш.

У розныя часы вёска была вотчынай роду Радзівілаў, цэнтрам маёнткаў Бокшаў і Вітгенштэйнаў, потым належала Дараганам. Сёння Радуцічы — невялікі населены пункт, дзе жыве ўсяго 236 чалавек. Амаль усе яны прыйшлі на свята роднай вёсачкі. Атрымалася яно па-сямейнаму душэўным. Падводзілі вынікі конкурсу на лепшы падворак, віншавалі перадавікоў сельскай гаспадаркі. Не засталіся без увагі старэйшая жыхары вёскі і ахвяры вайны. Па запрашэнні сельсавета ў госці прыехала дачка першага камсамольца вёскі Алена Шацько, якая падзялілася ўспамінамі пра свайго бацьку. Мясцовыя кандытары і рукадзельніцы арганізавалі выставы сваіх вырабаў і падзяліліся сакрэтамі майстэрства. У гандлёвых радах была магчымасць падсілкавацца смачнай выпечкай. Закончылася свята дыскатэкай і феерверкам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ПРЫВАТНЫ ІНТАРЭС

## НАД ВОЗЕРАМ...



**«З вясковага турыстычнага бізнесу можна жыць, калі гэтым усур'ёз займацца»,— лічыць Анатоль Мініч, гаспадар сядзібы «Азёрная жамчужына»**

Святлана ЯСКЕВІЧ

**«Азёрная жамчужына» ў Пінскім раёне — сядзіба па ўсіх мерках сярэдняя. Яна не ўражвае шыкоўнымі пабудовамі з натуральнага дрэва, ландшафтамі, зробленымі спецыялістамі-дызайнерамі, ці сучаснымі інтэр'ерамі, стылізаванымі пад даўніну. Тут усё даволі сціпла, але акуратна, прыгожа, зроблена сваімі рукамі, з любоўю. У двары шмат кветак, а замест прывычных ужо туй абапал дарожак растуць кусты ядлоўцу, якім гаспадыня сядзібы па-майстэрску надае акруглую форму.**

АГРАТУРЫЗМАМ Галіна і Анатоль Мінічы займаюцца ўжо добрыя пяць гадоў. Раней яны жылі і працавалі ў Пінску. У Заазер'і купілі домік пад дачу. Ездзілі сюды, як і ўсе, на выхадныя, садзілі агарод ды кветкі. Потым даведаліся, што прыняты адпаведны ўказ, што многія заняліся арганізацыяй адпачынку ў вёсцы,— расказвае Анатоль. Падумалі неяк з жонкай, параіліся і рашылі паспрабаваць. Тым больш, што такую прыгажосць нельга не паказаць людзям.

І праўда, месца, дзе знаходзіцца дом Мінічаў, асабліваe. Іх дом крайні на вуліцы Вясёлай. Стаіць ён на ўзвышшы. А ўнізе — маляўнічае шырокае возера Гарадзішчанскае. Звесткі пра гэта возера ёсць у адным з летапісаў 1464 года,— ганарыцца Анатоль. А вада ў ім — чыстая, бераг пясчаны. У спёку тут да сотні, а то і больш адпачывальнікаў збіраецца. Вокны спальных пакояў выходзяць якраз на возера. Для аматараў прыроды лепшага месца не прыдумаеш — хоць карціны пішы.

Дык вось пяць гадоў таму Мінічы ўзялі крэдыт і пачалі добраўпарадкаваць сядзібу. Паступова з'явіліся лазня, невялікая прыбудова з двума спальнымі пакоямі, кампактная банкетная зала, більярд. Для малых гасцей у двары разгортваецца батут, басейн, ёсць арэлі.





Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

— Пражыванне ў нас каштуе 100 тысяч рублёў на чалавека ў дзень,— расказвае Анатоль Мініч. З дзяцей да 10 гадоў за пражыванне не бяром. Расцэнак на харчаванне быць не можа, бо госці замаўляюць рознае. Адзін просіць, умоўна кажучы, чай з бутэрбродам, другому трэба паўтара кілаграма мяса і міску салаты. Але цэны ставім разумныя. Пражыванне ў нас увогуле недарагое. Калі сюды трапляюць камандзіровачныя, то здзіўляюцца: у гасцініцы такіх расцэнак ужо няма.

За арэнду сваёй банкетнай залы мы бяром 1,5 мільёна за суткі. Многім гэта выгадна. Прыязджаюць як на карпаратывы, так і на сямейныя святы. Напрыклад, на другі дзень вяселля невялікай кампаніяй,— працягвае гаспадар.

Для таго, каб прапанаваць дэмакратычныя расцэнкі, тут стараюцца эканоміць на ўсім. Напрыклад, дызайнер з горада прапанавала ўпрыгожыць банкетную залу за два з паловай мільёны рублёў. Тады дачка Мінічаў купіла ў краме льняной тканіны, сама прыдумала эскізы, пашыла дэкор, змайстравала кветкі. Атрымалася сціпла, але прыгожа і ў разы танней. Гасцям падабаецца.

За год ў «Азёрнай жамчужыне» адпачывае 300–400 чалавек, калі не лічыць карпаратывы. Найбольш бывае наведвальнікаў з Расіі. Адпачывалі тут і з Украіны, Казахстана, Прыбалтыкі, Германіі; былі госці нават з Амерыкі — са штата Каларада. Гэтым летам гасцявалі італьянцы, абяцалі яшчэ прыехаць.

Першыя гады Анатоль з Галінай працавалі на асноўнай рабоце, а сядзібай займаліся толькі ў вольны час. Цяпер абое працу пакінулі і засяродзіліся на сваім турыстычным бізнесе і добраўпарадкаванні сядзібы.

— Для таго каб развіваць сельскі турызм, у нас усё ёсць,— лічыць Анатоль, спасылаючыся на ўказ № 372. Пры цяперашняй сітуацыі з гэтага можна жыць, калі не ленавацца. Праўда, апошнім часам з размоў з калегамі Мініч даведаўся, што крэдыт узяць стала вельмі складана. Паводле яго меркавання, трэба дазволіць розным банкам (напрыклад, камерцыйным) крэдытаваць развіццё сельскага турызму. Калі ён сам афармляў крэдыт, зрабіць гэта было нашмат прасцей.

**Бываюць сітуацыі, калі адначасова аднаму трэба падаваць шашлык, у другога шар тэнісны згубіўся, а трэцяму закарцела пакатацца на лодцы... І ўсё неабходна «разруліць» — весела, нібы незнарок.**

Гаспадар «Азёрнай жамчужыны» лічыць, што не ўсе могуць займацца такой справай, бо для гэтага трэба мець асаблівы характар. Паводле слоў Анатоля Іванавіча, важна любіць людзей і ўмець знаходзіць агульную мову з усімі. На адпачынак прыязджаюць вельмі розныя кліенты. І кожнаму трэба дагадзіць, улічыць яго інтарэсы, густ, перавагі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

МЯСЦОВЫ ЧАС

## «ХУТКАЯ ДАПАМОГА» ЗАЎСЁДЫ ПОБАЧ

Нэлі ЗІГУЛЯ

**У старшыні Махаўскага сельскага Савета Магілёўскага раёна Валянціны Камленка час распісаны па хвілінах. На вёсцы спраў хапае. А іх, гэтых вёсак, у сельсавеце 13. У Косцінцы, напрыклад, зараз вядзецца праца па зносе састарэлага жылля, а ў экскаватара, як на тое ліха, зламалася дэталь. Можна было б пачакаць, пакуль арганізацыя сама яе замяніць, але ж для гэтага спатрэбіцца час. І каб не марнаваць яго, старшыня самастойна адправілася па новую. Такі яна чалавек.**

### *Без газу і каналізацыі?*

Перад тым як сустрэцца з Валянцінай Камленка і распытаць пра найбольш папулярныя на вёсцы сацыяльныя паслугі, пагутарыла з пенсіянерамі аграгарадка Махава. Для жыхароў суседніх населеных пунктаў, што ўваходзяць у склад сельсавета, цэнтральная сядзіба — нешта накшталт горада. Тут, маўляў, цывілізацыя. Вёска і насамрэч прыгожая, мясціны маляўнічыя, возера, шмат зелені. «Толькі гэта прыгажосць адным дачнікам на радасць,— прыпыніла маё захапленне пажылая кабета.— Пацікаўцеся лепш, як людзі жывуць на вуліцах Садовая і Садовая 1. Домікі ў іх прыгожыя, а вось каналізацыі няма. Нават памыць бялізну праблема, бо трэба ж кудысьці з дому брудную ваду вынесці». «І з газам у нас не ўсё так добра, як хацелася б,— далучаецца да размовы яшчэ адзін мясцовы жыхар.— Вунь у іншых вёсках вентыль адкрыў і карыстайся. А ў нас каменны век — газ толькі ў балонах. Яшчэ аграгарадок называецца». Знайшліся людзі, якія паскардзіліся і на адсутнасць месцаў адпачынку для моладзі. Маўляў, нават кавярні няма — прыходзіцца ў суседнія вёскі ездзіць. Спартзала? Ёсць, нават дзве. Адна пры Доме культуры. Але як яна працуе, жыхары чамусьці не ведаюць. Затое «зелля» ў крамах для аматараў выпіць заўсёды хапае.

«Як жа так?» — прашу патлумачыць гэтыя скаргі Валянціну Камленка. «Гэтыя скаргі — у большасці ад утрыманскіх настрояў,— лічыць дэпутат.— Людзі да апошняга спадзяюцца, што іх пытанні вырашыць дзяржава. Той жа кааператыў «па газе» толькі летась стварылі. Раней 70% аплаты пагашала дзяржава, а зараз, наадварот, спажыўцы. Кожны ж спадзяваўся, што атрымае газ бясплатна, вось і дачакаліся. Але нават на такіх умовах існуюць цяжкасці. Перад намі ў чарзе 26 кааператываў, а фінансуюцца толькі 2 у год». З каналізацыяй для вуліц Садовая і Садовая 1 становішча крыху лепшае. Па словах старшыні, трубы пакладзены, насосная станцыя пабудавана, застаецца толькі падпісаць дагавор і заплаціць за адвод ад кожнага канкрэтнага дома.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

■ Кашалёк

# ЯК ПРАЦУЕШ — ТАК І ЗАРАБЛЯЕШ



## Але прадукцыйнасць працы павінна прырастаць за кошт мадэрнізацыі, а не дадатковых «напружванняў» работніка

**Пастанова Савета Міністраў ад 31 ліпеня 2014 года № 744 «Аб аплаце працы работнікаў» знайшла ў народзе і абаронцаў, і праціўнікаў. Нагадаем: гэты дакумент прадугледжвае, што ў дзяржаўных арганізацыях рост намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў дапускаецца толькі пры ўмове апераджальнага росту прадукцыйнасці працы. Акрамя таго, пастанова абмяжоўвае зарплату кіраўніка прадпрыемства. Адны цяпер загаварылі аб сацыяльнай справядлівасці, другія — аб непатрэбнасці падобных захадаў, трэцім не спадабалася, што іх зноў да нечага абавязваюць.**

### КАНФІСКАВАЦЬ ЛІШКІ?

З такой прапановай раз-пораз выступаюць на інтэрнэт-форумах пры абмеркаванні згаданай пастановы. Напрыклад, вось у такой фармулёўцы: «Думаю, што трэба ўвогуле ўвесці закон, па якім узровень даходаў фізічнай асобы не можа перавышаць, скажам, 2000 долараў у месяц, а лішкі канфіскаваць... Такі закон абараняў бы нарэшце інтарэсы 95% насельніцтва, якія атрымліваюць менш за 2000 «зялёных». Іншыя выказваюцца не так радыкальна: «Добраму работніку павінны плаціць добрую зарплату, а кіраўніку — згодна з тым, як ён арганізуе працу і матывуе рабочага». Спрабуюць апраўдацца і кіраўнікі: «Вы шмат не ўлічваеце. Вось вы атрымалі 100 рублёў выручкі і заплацілі 20% ПДВ. Мінус выдаткі на арэнду і іншае. Заплацілі падатак на прыбытак. Каб налічыць вам з гэтых 100 рублёў 30, арганізацыя павінна ўнесці ў Фонд сацабароны 34% ад вашай зарплаты, а значыць, ужо больш за 40 рублёў. Мінус іншыя выплікі. У выніку павінен застацца чысты прыбытак, ці дывідэнды заснавальнікаў, з якіх таксама трэба плаціць падатак...»

Карацей, так ці інакш дакумент закрануў усіх. У большай ступені, зразумела, дзяржаўныя арганізацыі і арганізацыі, у статутным фондзе якіх доля ўласнасці дзяржавы складае больш за 50%, бо для іх гэтыя нормы абавязковыя. Пры невыкананні гэтай умовы фонд заработнай платы за справаздачны месяц памяншаецца да памеру, які забяспечвае суадносіны росту прадукцыйнасці працы і заработнай платы не менш за 1,0. А вось уласнікам маёмасці арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці, у тым ліку арганізацый, у статутным фондзе якіх доля ўласнасці дзяржавы складае менш за 50%, толькі рэкамендавана не дапускаць апярэджання росту намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў над ростам прадукцыйнасці.

Чакаецца, што нормы пастановы павінны нацэліць арганізацыі не толькі на вытворчасць прадукцыі, тавараў, работ, паслуг, але і на іх рэалізацыю, што будзе садзейнічаць зніжэнню складскіх запасаў і росту даходаў арганізацый. У сувязі з гэтым у якасці паказчыка пры вызначэнні прадукцыйнасці працы ў арганізацыях вызначана выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг на аднаго сярэдняспісачнага работніка.

Дарэчы, пастановай устаноўлены адзіны для арганізацый усіх формаў уласнасці парадак выплаты бонусаў. У мэтах скарачэння разрыву ў аплаце працы кіраўнікоў і работнікаў камерцыйных арганізацый зацверджана, што пры разліку каэфіцыента іх суадносін будуць улічвацца гадавыя бонусы. Яны выплачваюцца кіраўнікам такіх арганізацый, у суме якая перавышае 12 акладаў. Пры гэтым памер гадавога бонуса для кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый абмяжоўваецца 12 акладамі. Да арганізацый усіх формаў уласнасці таксама даведзена, што разрыў у заработнай плаце кіраўніка і работнікаў не павінен перавышаць 8. Іншымі словамі, вылічваецца сярэдні заробак па прадпрыемстве, на які дзеліцца заробак кіраўніка. Пасля глядзяць на атрыманы каэфіцыент: калі ён будзе перавышаць 8, то альбо павялічваюць заробак работнікам, альбо памяншаюць кіраўніку. Гэтая норма накіравана на забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і адказнасці бізнесу.

**«З 1 верасня павысілі зарплату настаўнікам і ўрачам. Але можна было б яе павысіць яшчэ больш, калі б на кожнага, хто лечыць ці выкладае, было менш розных арганізатараў, кантралёраў, рэвізораў, метадыстаў і гэтак далей».**

Нацыянальнаму банку рэкамендавана прытрымлівацца аналагічных падыходаў у дачыненні да заработнай платы кіраўнікоў і работнікаў банкаў. Міністэрству працы і сацыяльнай абароны і Міністэрству эканомікі даручана даваць тлумачэнні па пытаннях прымянення пастановы.

### НА НЕКАТОРЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ЗАРПЛАТА МОЖА ПАНІЗІЦЦА?

**Міхаіл КАВАЛЁЎ, дэкан эканамічнага факультэта БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь,** сцвярджае, што дабрабыт краіны і кожнага чалавека залежыць ад усяго таго, што мы стварылі за год — валавога ўнутранага прадукту: «У Беларусі ён, па апошніх звестках МВФ, складае прыкладна 16 тысяч долараў па парытэтных цэнах. Для параўнання: у вядучай краіне Еўрасаюза Германіі — каля 35 тысяч долараў. Атрымліваецца, што наш жыццёвы ўзровень складае ад нямецкага 40%, хаця яшчэ 20 гадоў таму было толькі 19%. Гэта адбываецца толькі за кошт росту прадукцыйнасці працы. Сёння наш ВУП — сума дабаўленых вартасцяў усіх вялікіх і малых прадпрыемстваў краіны — знаходзіцца прыкладна на ўзроўні 160 млрд долараў, а працуе ў краіне 4,5 мільёна чалавек. Значыць у сярэднім прадукцыйнасць працы — прыкладна 35,5 тысячы долараў. Атрымліваецца, што за год наш работнік стварае тавараў і паслуг на гэтую суму. У тых жа немцаў — амаль 80 тысяч. Мы жывем горш больш чым у два разы, бо працуем горш у тыя ж два разы. Таму для павышэння нашага дабрабыту нам неабходны рост прадукцыйнасці.

Кожны грамадзянін скажа: «Я быццам і так напружваюся на працы». Зразумела, што гэта залежыць не толькі ад кожнага з нас, але і ад тэхнічнага ўзбраення, тэхналогій. Калі мы на традыцыйных вытворчасцях скароцім лайдакоў, а самі пачнём працаваць лепш, то ўсё пойдзе нармальна. Скажам, з 1 верасня павысілі зарплату настаўнікам і ўрачам. Але можна было б яе павысіць яшчэ больш, калі б на кожнага, хто лечыць ці выкладае, было менш розных арганізатараў, кантралёраў, рэвізораў, метадыстаў і гэтак далей. Нам трэба дамагчыся таго, што ў апараце кіравання будуць еўрапейскія стандарты — суадносіны паміж тымі, хто вучыць і лечыць, і тымі, хто ім гэта дапамагае рабіць.

Беспрацоўя ў краіне няма, таму нічога страшнага, калі вызваляць частку рабочай сілы. Але не выключаю, што на некаторых прадпрыемствах зарплата можа панізіцца. Калі яны ствараюць прадукцыю, якую не ўмеюць прадаць, то, зразумела, што ні аб якім павышэнні заробку не можа быць размовы. Але гэта выхавае пэўны патрыятызм. Калі рабочы завода «Атлант» купляе халадзільнік «Indesit», то гэтым самым ён скарачае сабе зарплату. Тады ён будзе дакручваць усе гайкі так, каб самому захацелася купіць халадзільнік, зроблены сваімі рукамі».

**Разрыў у заработнай плаце кіраўніка і работнікаў не павінен перавышаць 8. Іншымі словамі, вылічваецца сярэдні заробак па прадпрыемстве, на які дзеліцца заробак кіраўніка.**

### СУПРАЦЬ ФІЗІЧНЫХ НАГРУЗАК І ЗНІЖЭННЯ ЗАРОБКУ

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі мае сваё меркаванне адносна пастановы Саўміна. Як паведамілі нашаму карэспандэнту ў прэс-службе, «федэрацыя заўсёды выступала і выступае за тое, каб павышалася прадукцыйнасць працы, бо гэта адзін з найважнейшых фактараў, якія ўплываюць на рост прыбытку і павелічэнне даходаў прадпрыемстваў». Аднак рост прадукцыйнасці працы там звязваюць з укараненнем на айчынных прадпрыемствах новай тэхнікі, комплекснай аўтаматызацыі, удасканаленнем машын і абсталявання, а не з павелічэннем фізічных нагрузак на працоўных. «Федэрацыя прафсаюзаў выступае за павышэнне прадукцыйнасці працы, заснаванае на ўжыванні больш эфектыўных і дасканалых формаў працы, але катэгарычна супраць памяншэння заробкаў, нават калі яно закране толькі нязначныя катэгорыі работнікаў».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

# СТАЎКА НА ЯКАСЦЬ

## Вызначаны прэтэндэнты конкурсу на саісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці




Якасць з'яўляецца вызначальным фактарам канкурэнтнай устойлівасці і эфектыўнай эканомікі кожнага прадпрыемства і краіны ў цэлым. Займаць стабільнае становішча на ўнутраным і знешніх рынках — задача не з простых. Але тыя кампаніі, якія выбудоўваюць стратэгію свайго развіцця на аснове якасці ва ўсіх сферах дзейнасці, дасягаюць найлепшых вынікаў.

І такія прадпрыемствы-лідары ў рэспубліцы ёсць. З 1999 года лаўрэатамі конкурсу на суісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, які праводзіцца штогод, сталі 189 лепшых арганізацый, прычым некаторыя з іх — неаднаразова.

Далучыцца да іх сёлета імкнуцца яшчэ 30 арганізацый.

«З нашага пункту гледжання, вельмі важна, каб уся прамысловасць краіны займалася якасцю, і гэтая задача павінна быць вырашана паўсюдна, практычна на кожным прамысловым прадпрыемстве, у кожнай арганізацыі сферы паслуг і іншых галін», — лічыць **старшыня Дзяржстандарта Беларусі Віктар НАЗАРАНКА.**

Найбольш вострая барацьба за званне лаўрэата ў гэтым годзе чакаецца па такіх кірунках дзейнасці, як вытворчасць харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама аказанне паслуг і выкананне работ.

Цяпер эксперты разглядаюць дакументы, прадстаўленыя прэтэндэнтамі, пасля чаго яны наведаюць гэтыя прадпрыемствы.

Арганізацыі, прызнаныя лепшымі ў галіне якасці, будуць аб'яўлены ў канцы года. Лаўрэатам уручаць дыпломы і сімвалы прэміі, а таксама дадуць права выкарыстоўваць у маркіроўцы прадукцыі, дакументацыі і ў рэкламных матэрыялах выяву эмблемы прэміі. Акрамя гэтага, спіс пераможцаў будзе размешчаны на інтэрнэт-сайце Дзяржстандарта Рэспублікі Беларусь, уключаны ў штогадовы ілюстраваны каталог лаўрэатаў конкурсу, які перадаецца ў прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой.

**Дар'я ШОЦІК.**

■ Грошы

# НЕ ЎСІМ ПА КІШЭНІ...

**Аналітычная група Беларусбанка адзначае сёлета зніжэнне попыту насельніцтва на жыллёвыя крэдыты (на агульных падставах), што абумоўлена высокімі працэнтнымі стаўкамі па такіх крэдытах.**




Фота Пятра ФАМІНА.

Тут трэба нагадаць, што ў агульным аб'ёме выдадзеных сёлета насельніцтву крэдытаў на фінансаванне нерухомасці з улікам ільготных крэдытаў удзельная вага Беларусбанка ў банкаўскай сістэме краіны склала 85%, на рынку камерцыйнага крэдытавання — больш за 25%.

Крэдыты на будаўніцтва жылля на ўмовах, вызначаных банкам, заўсёды былі запатрабаваны насельніцтвам. На працягу некалькіх гадоў назіраўся ўстойлівы рост выдачы такіх пазык. Так, у 2012 годзе крэдытамі на нерухомасць скарысталіся больш за 8 тысяч крэдытаатрымальнікаў, у 2013 — амаль 13 тысяч. А вось сёлета па падобнай лініі фінансавання назіраецца ўжо адмоўная дынаміка, бо не ўсім кліентам такія крэдыты сталі даступнымі. Справа ў тым, што, згодна з дзеючым заканадаўствам, банкі маюць права самастойна вызначаць умовы прадастаўлення крэдытаў фізічным асобам, у тым ліку стаўку па крэдыце і яго максімальны памер.

Беларусбанк фінансуе да 75% кошту будаўніцтва жылога памяшкання. Гэты паказчык вызначаны з улікам патрабавання дзяржаўнай жыллёвай палітыкі, якой прадугледжана павелічэнне долі ўдзелу уласных сродкаў грамадзян не менш як да 50% ад кошту будаўніцтва жылля, што пацвярджае плацежаздольнасць і рэальныя фінансавыя магчымасці крэдытаатрымальніка.

З пачатку года буйнейшым банкам краіны на 3,5 працэнтнага пункта зніжана стаўка па крэдыце на фінансаванне нерухомасці, што абумоўлена зніжэннем стаўкі рэфінансавання Нацбанка Беларусі і кошту рэсурсаў, што прыцягваюцца Беларусбанкам, а таксама кан'юнктурай рынку і сацыяльнай накіраванасцю асобных відаў крэдытаў.

У прэс-службе Беларусбанка нам паведамілі, што цяпер крэдыты на фінансаванне нерухомасці выдаюцца людзям пад 35% гадавых. Стабільная эканамічная сітуацыя, узважаная грашова-крэдытная палітыка, якая праводзіцца Нацыянальным банкам, і запаволенне тэмпаў росту ўзроўню інфляцыі ствараюць перадумовы для зніжэння працэнтных ставак, упэўнены ў Беларусбанку.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# ДОБРЫ ВЫНІК — ДАДАТКОВЫ ПРЫБЫТАК

**Фінансавыя сродкі раёнам Мінскай вобласці будуць выдзяляцца ў залежнасці ад выканання імі прагнозных паказчыкаў. Аб гэтым паведаміў на пасяджэнні аблвыканкама па падвядзенні вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця цэнтральнага рэгіёна за першае паўгоддзе старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Шапіра.**

Сёлета бюджэты раёнаў былі сфарміраваны прапарцыянальна колькасці жыхароў. У наступным годзе, па яго словах, за аснову будуць брацца аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі і прадукцыі сельскай гаспадаркі. Такі падыход, лічыць кіраўнік вобласці, будзе справядлівы і аб'ектыўны: «Калі раён справіўся з прагнознымі паказчыкамі, зарабіў фінансавыя сродкі, то ён павінен атрымаць дадатковыя грошы. Чаму мы іх павінны перадаваць раёну, які не паказаў добрага выніку?»

Сямён Шапіра яшчэ раз нагадаў, што старшыні райвыканкамаў нясуць асабістую адказнасць за развіццё сваіх рэгіёнаў. Пры гэтым ён падкрэсліў, што некаторыя кіраўнікі рэгулярна абяцаюць выправіць сітуацыю. Аднак на справе рэальных вынікаў іх работы не відаць. Таму трэба дакладна прааналізаваць, якія ўказанні яны даюць на месцах, якія задачы ставяць, што робяць для наводзення парадку на давераных ім тэрыторыях.

Старшыня Мінаблвыканкама таксама даручыў сваім намеснікам у бліжэйшы час сустрэцца з кіраўнікамі ўсіх прадпрыемстваў вобласці, дзе за першае паўгоддзе нездавальняючыя эканамічныя паказчыкі. Прычым па кожным такім суб'екце гаспадарання зрабіць канкрэтныя вывады па выніках дзейнасці за 9 месяцаў і прадставіць планы па аздараўленні сітуацыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Партнёры

# ДАМОВІЛІСЯ? БУДЗЕМ ДЗЕЙНІЧАЦЬ

## Кувейт хоча інвеставаць у сумесныя з нашай краінай праекты



**Другое пасяджэнне сумеснай беларуска-кувейцкай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве прайшло ў Мінску. Прадстаўнікі абедзвюх краін асаблівую ўвагу надавалі развіццю супрацоўніцтва ў сферах эканомікі і інвестыцый.**

**Валянцін РЫБАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў нашай краіны,** па выніках сустрэчы з кувейцкімі калегамі паведаміў, што камісія папрацавала плённа.

— Мы абмяркоўвалі розныя пытанні па ўмацаванні двухбаковага ўзаемадзеяння ў эканоміцы, інвестыцыях і іншых галінах. Зараз перад намі наступны этап працы — рэалізацыя ўсіх дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты. Беларускі бок зробіць усё, каб гэтыя дамоўленасці былі выкананы.

У сваю чаргу, **кіраўнік дэлегацыі з Кувейта Халіфа МУСАІД ХАМАДА, намеснік міністра фінансаў гэтай краіны,** звярнуў увагу на значныя перспектывы для інвестыцыйнага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння па іншых кірунках паміж дзвюма краінамі. Ён адзначыў, што на пасяджэнні абмяркоўвалася магчымасць рэалізацыі ў бліжэйшы час некалькіх праектаў.

Падчас пасяджэння камісіі было вырашана, што наступны раз камісія сустрэнецца ў 2015 годзе ў Эль-Кувейце.

Кувейт — адна з найбагацейшых краін свету. Краіна валодае велізарнымі запасамі нафты — прыкладна 9% ад усіх сусветных запасаў. Насельніцтва краіны невялікае — прыкладна 2,5 мільёна чалавек. Паколькі дзяржава багатая, то яна мае магчымасць аказваць значную фінансавую дапамогу сваім грамадзянам. Так, медыцына і адукацыя бясплатныя, а калі малады чалавек хоча атрымаць адукацыю за мяжой, то ўрад бярэ ўсе выдаткі на сябе. А гэта плата за навучанне, пералёт, стыпендыя. Дапамога разведзенай жанчыне будзе выплачвацца штомесяц у памеры 1400 долараў ЗША да таго часу, пакуль яна не працаўладкуецца або не выйдзе зноў замуж. Мінімальная пенсія складае прыкладна 3000 долараў. Грашовую дапамогу аказваюць і ў сувязі з важнымі дзяржаўнымі юбілеямі. Так, да 50-годдзя незалежнасці краіны ўсе грамадзяне атрымалі па 3,5 тысячы амерыканскіх долараў. Натуральна, усе льготы і бонусы прадастаўляюцца выключна кувейтцам. Тым жа, хто прыязджае туды на працу, прыходзіцца клапаціцца пра сябе самім. Атрымаць грамадзянства гэтай краіны амаль немагчыма.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

■ Сваё — лепшае

# НОВЫ КАМБАЙН СТЫМУЛЮЕ АЙЧЫННЫХ ВЫТВОРЦАЎ

**Новы зернеўборачны камбайн «Палессе GS16», які зараз дапрацоўваецца на РУП ВА «Гомсельмаш», павінен замяніць імпартныя аналагі. Як расказалі на прадпрыемстве, аднаўленая версія будзе падрыхтавана да лістапада, а першая вопытная партыя павінна выйсці на палеткі краіны да пачатку ўборачнай 2015 года.**

Між іншым, праграма камбайнабудавання стымулявала творчую думку спецыялістаў многіх прадпрыемстваў Беларусі. У яе ажыццяўленне ўцягнуты многія айчынныя вытворцы, якія актыўна асвойваюць выраб прынцыпова новай прадукцыі. Напрыклад, ААТ «Гомельшкло» стала вырабляць панарамнае шкло для кабін збожжаўборачных гігантаў, а ААТ «Інтэграл» — бартавыя камп'ютары для сучасных камбайнаў. Задзейнічана і ААТ «Белшына», дзе распрацаваны і вырабляюцца спецыяльныя шырокапрофільныя шыны для магутнай сельскагаспадарчай тэхнікі. Пры гэтым асноўныя вузлы на «Гомсельмашы» вырабляюць самі, хоць пакуль што не абыходзіцца і без замежных камплектуючых. Магутныя рухавікі, якія патрабуюцца для машыны GS16, здольнай эфектыўна ўбіраць збожжа на палях з ураджайнасцю 70-100 ц/га, будуць набывацца ў надзейных сусветна вядомых вытворцаў.

«Палессе GS16» — магутны і прадукцыйны камбайн, які не павінен уступаць нямецкім і амерыканскім аналагам, але павінен мець больш прыцягальны для спажыўца кошт», — лічаць на прадпрыемстве. Дарэчы, аграрыі змогуць яго выкарыстоўваць не толькі для збожжавых каласавых культур, але і для ўборкі кукурузы, сланечніку, зернебабовых, крупяных культур і рапсу — з ужываннем спецыяльных прыстасаванняў. Плануецца, што ААТ «Гомсельмаш» зможа выпускаць да паўсотні новых машын у год. Гэта ў перспектыве дазволіць цалкам адмовіцца ад закупкі дарагіх замежных аналагаў. Цяпер машына завяршае выпрабаванні.




**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■

■ У пошуках нафты

# РЭКОРД ГЛЫБІНІ

**На нафтавых радовішчах нашай краіны зафіксаваны рэкорд глыбіні свідравання, паведамляе прэс-служба вытворчага аб'яднання «Беларуснафта».**

Цяпер яна складае 5625 метраў. Новы рэкорд зафіксаваны на першай звышглыбокай параметрычнай свідравіне №1 Прадрэчыцкая і ўсталяваны 27 жніўня. Аўтарства рэкорду належыць брыгадзе Сяргея Бальшакова, якая працуе на свідравальнай устаноўцы Bentec.

Падобны паказчык хоць і з'яўляецца абсалютным рэкордам глыбіні за ўсю гісторыю бурэння ў Беларусі, але будзе не канчатковым. Бурэнне на гэтай свідравіне працягваецца. Згодна з праектам, яе канчатковая глыбіня павінна скласці 6680 м. Чакаецца, што гэтая свідравіна стане самай глыбокай не толькі ў Беларусі — аналагаў ёй не будзе і на прасторах СНД. Цяпер у Расіі існуюць свідравіны такой працягласці, але яны гарызантальныя. А 1-я Прадрэчыцкая — нахільна-накіраваная, з вуглом адхілення 470 м.

Бурэнне на 1-й Прадрэчыцкай распачата з мэтай пошуку залежаў вуглевадародаў у адкладах міжсалявых комплексаў і ацэнкі перспектыў знаходжання нафты і газу ў межах міжсалявой пасткі.

Што тычыцца папярэдняга рэкорду, то да нядаўніх часоў самай глыбокай у Беларусі лічылася свідравіна №9001г Геалагічная. Яе «глыбінны» рэкорд быў 5553 метры. Гэтая адзнака была дасягнута 24 жніўня 2008 года і пратрымалася 6 гадоў і 3 дні.

Вытворчыя магчымасці сучаснай свідравальнай устаноўкі дазваляюць шукаць неабходныя для краіны энерганосьбіты на глыбіні да 7 тысяч метраў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

**ОАО «Амкодор-Дзержинск»**
222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 15 сентября 2014 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, кабинет директора Общества.**

**Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.**

**Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 5 сентября 2014 г.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
Об увеличении уставного фонда ОАО «Амкодор-Дзержинск» путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 2 сентября 2014 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 8 сентября 2014 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 600005769

*Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»*

■ Усё будзе добра

# МІКІТА ВУЧЫЦЦА РАЗМАЎЛЯЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

## Разам з нашымі вучнямі за парты селі і ўкраінскія

**Для Мікіты Цяпкова з данецкага горада Харцызск першы ў гэтым навучальным годзе званок прагучаў у магілёўскай школе № 26. У нашу краіну ён разам з бацькамі і старэйшым братам Максімам прыехаў 8 жніўня. Сям'я і так мела намер застацца тут назаўсёды. А цяпер, пасля з'яўлення Указа Прэзідэнта «Аб знаходжанні грамадзян Украіны ў Рэспубліцы Беларусь», дзякуючы якому быў вырашаны цэлы комплекс праблем, гэтае жаданне толькі ўмацавалася.**



Сям'я Цяпковых.

У родным Харцызску Мікіта скончыў 8 класаў. Не спадзяваўся, што апошні раз бачыцца са сваімі школьнымі сябрамі. Зараз яны спісваюцца па інтэрнэце. З іх вялікага класа, дзе разам вучыліся 28 чалавек, у Харцызску нікога не засталося.

Раман і Ксенія Цяпковы яшчэ да таго, як разам з сынамі селі ў свае «Жыгулі», ведалі, што будуць шукаць шчасце ў Беларусі. Яны — карэнныя жыхары Данецкай вобласці, але на Магілёўшчыне ў іх добрыя сябры, з якімі яны пазнаёміліся ў сябе на радзіме. Калі пачаўся канфлікт у паўднёва-ўсходняй частцы краіны, гасцінныя беларусы запрасілі сям'ю да сябе. І Цяпковы не сталі спакушаць лёс — сабралі дакументы, пагрузілі няхітры скарб у машыну і накіраваліся да расійскай мяжы, каб потым рушыць да Беларусі. Рашэнне назаўсёды перабрацца сюды не было спантанным, запэўнівае Раман.

— Прадпрыемствы прыпыняюць працу, заказаў усё менш, — кажа ён. — У нас, напрыклад, на Макееўскім металургічным заводзе рабілі шахтавыя канвееры. Але шахты сталі, і людзей пачалі разлічваць. Прыпыніў работу трубны завод, дзе працавала жонка. У нас наогул уся вытворчасць на 70% завязана на Расіі.

Апошнія два месяцы ў Харцызску было зусім цяжка, — дадае Ксенія. — Ваду ўключалі толькі раніцай гадзіны на дзве. У газавую трубу трапіў снарад, не было святла. Ад абстрэлаў хаваліся па падвалах. (На ўвесь горад 3 больш-менш добрыя бомбасховішчы.)

Да ад'езду рыхтаваліся загадзя. У школе напісалі заяву і забралі дакументы. Там паклапаціліся, каб на выпадак выезду на кожнага вучня быў гатовы ўвесь неабходны пакет — з характарыстыкамі, медыцынскай карткай, табелем аб паспяховасці і нават даведкамі аб прышчэпках. На прадпрыемствах усім раздалі працоўныя кніжкі. (Былі выпадкі, калі дакументы згаралі пры бамбёжцы. Як у Краматорску.)

**У родным Харцызску Мікіта скончыў 8 класаў. Не спадзяваўся, што апошні раз бачыцца са сваімі школьнымі сябрамі. Зараз яны спісваюцца па інтэрнэце. З іх вялікага класа, дзе разам вучыліся 28 чалавек, у Харцызску нікога не засталося.**

Першыя два тыдні ў Беларусі сям'я жыла ў знаёмых на лецішчы. Спачатку звярнуліся ў пашпартна-візавую службу, каб легалізавацца, а потым пачалі шукаць працу. Шмат паездзілі па вёсках, аграгарадках, пакуль не вырашылі спыніцца ў Магілёве.

— Я, напрыклад, інжынер-металург, жонка таксама тэхнічны работнік, а на вёсцы ветэрынары патрэбны ды заатэхнікі, — кажа Раман. — Купілі газету «Праца для вас» і сталі метадычна абзваньваць усіх працадаўцаў. Знайшлі аб'яву, што патрабуюцца работнікі на прадпрыемства «Протас». Патэлефанавалі — і для нас з сынам там знайшлася праца. Нас узялі апаратарамі паста кіравання ў новы цэх, які размяшчаецца пад Магілёвам у Салтанаўцы. Дзякуй прадпрыемству — за спецдазвол для нас тут заплацілі па 750 тысяч рублёў. А вось за меддаведкі прыйшлося аддаць амаль 2 мільёны на дваіх. Грошы вялікія, улічваючы, што ўсе нашы сродкі — гэта тое, што мы атрымалі пры разліку.

З кватэрай таксама пашанцавала. Гаспадар, калі даведаўся, адкуль жыльцы, пятую частку з кошту скінуў. Нават перадаплаты не браў, сказаў: маўляў, з першага заробку аддасце. Суседка па пляцоўцы таксама вельмі добрая. Яна, былая настаўніца матэматыкі, запрашала, калі спатрэбіцца дапамога, звяртацца.

Чырвоны Крыж на кожнага чалавека выдзеліў па 200 тысяч рублёў на прадукты. І вельмі падтрымалі сям'ю валанцёры.

— Нам проста шанцуе на добрых людзей, — кажа Раман. — У нас быў вельмі прыгнечаны настрой. Вось так здымацца з нажытага месца не проста. Там засталіся кватэра, мэбля. За імі даглядае пляменніца. З сабой бралі толькі самае неабходнае: дакументы, цёплыя рэчы. А валанцёры нас падбадзёрылі — далі маленькі каляровы тэлевізар, тазік для мыцця, іншыя патрэбныя рэчы, дапамаглі з адзеннем. Нават падказалі тэлефоны суайчыннікаў з Данецка.

Дзевяцікласнік Мікіта, нягледзячы на зусім не дзіцячыя выпрабаванні, поўны аптымізму.

— Пакуль усё падабаецца, — прызнаецца ён. — Спадзяюся, што найду тут надзейных таварышаў.

Мікіта захапляецца спортам, займаўся баскетболам, варкаўтам, у басейн хадзіў. Мяркуе, што і тут у яго знойдуцца сябры па інтарэсах. Бацькі лічаць, што са школай ім вельмі пашанцавала. Ад дому, дзе яны здымаюць кватэру, да яе рукой падаць. Засталіся добрыя ўражанні і ад бяседы з кіраўніцтвам школы.

— Дырэктар сказаў Мікіту: маўляў, калі будуць нейкія праблемы, падыходзь — дапаможам, — усміхаецца маці. — Папярэдзіў, што на ўрокі трэба хадзіць у «класіцы». Ва Украіне, дарэчы, гэта таксама было. Толькі па суботах дазвалялі прыходзіць у джынсах, таму што дзень выхадны, а з урокаў былі толькі працоўнае навучанне ды літаратура.

На ўроках беларускай літаратуры і мовы Мікіта таксама будзе прысутнічаць: трэба ж прывыкаць да мовы. Завуч паглядзела характарыстыкі новага вучня і спытала, ці праўда, што ён такі добры хлопчык. Водгукі, пачынаючы з першага класа, самыя станоўчыя.

Тое, што прыйдзецца прывыкаць да новай праграмы, падлетка і яго бацькоў не палохае. Настаўнікі таксама падбадзёрылі: справіцца. У першы дзень Мікіта разам з іншымі вучнямі атрымаў падручнікі. Крыху здзівіла, што яны амаль удвая меншыя за ўкраінскія. Не зусім звыкла і тое, што класы па колькасці вучняў невялікія. У 9 «Б», напрыклад, куды прынялі Мікіту, іх усяго 16. (Ва Украіне звычайна колькасць вучняў у класе дасягае амаль 30 чалавек.) Прыйдзецца таксама прывыкаць да таго, што навучанне вядзецца не па 12-бальнай сістэме, а па 10-бальнай. Але гэта дробязі, лічаць перасяленцы.



Любіміца сям'і кошка Джолі змяніла прапіску разам са сваімі гаспадарамі.

У старэйшага брата Мікіты — Максіма — свае планы. На радзіме, перад тым як пайсці ў армію, ён вучыўся завочна ў політэхнічным тэхнікуме. Збіраецца прадоўжыць вучобу ў Магілёве. Кажа, што сёлета, напэўна, ужо спазніўся, а вось у наступным годзе абавязкова будзе паступаць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з дамашняга архіва Цяпковых**

# Гонар мундзіра

*Мінскі кінафестываль упершыню правядзе конкурс нацыянальнага кіно*

**Першай навіной ад дырэкцыі кінафестываля «Лістапад», які ў гэтым годзе адбудзецца ў дваццаць першы раз, стала аб'ява аб арганізацыі новага конкурсу. «Нацыянальны конкурс», як ён названы ў прэс-рэлізе, павінен увабраць у сябе ігравыя, дакументальныя, анімацыйныя; кароткаметражныя і поўнаметражныя карціны, створаныя беларусамі. На апошнім варта зрабіць акцэнт: важна, каб фільм быў зняты беларусамі, але не важна, дзе гэта адбывалася. Ці павінна ў агульнай кінапалітры праграмы выяўляцца беларуская ментальнасць, ці конкурс заклікаsuccеsы выставіць на ўсеагульны агляд таленавітыя працы беларусаў, ці проста пераканацца і пераканаць у тым, што гэты крытэрый адбору можа выявіць нешта вартае? Скажам, можна чакаць выканання кожнага пункта.**

Нягледзячы на тое, што ўсе карціны змяшаюцца ў агульным конкурсе, прадугледжаны тры ўзнагароды, якія атрымае ігравы, дакументальны і анімацыйны фільмы, а прысуджаць іх будзе асобнае міжнароднае журы.

«Лістапад» не зніжае планку. У конкурс будуць адабраны фільмы, якія адпавядаюць таму ўзроўню, які найбуйнейшы кінафорум краіны запытвае. Нават калі ўдзельнікаў будзе няшмат, можна быць упэўненым: яны вартыя ўвагі і ацэнкі. Такім чынам, у праграме (не важна, колькі фільмаў яна ў сябе змесціць) можна ўбачыць карціну сучаснай беларускай кінатворчасці.

Пачатак прыёму заявак абвешчаны адносна нядаўна, аднак з тых фільмаў, што паспелі даслаць у дырэкцыю кінафестывалю, ужо, кажуць, можна нешта вылучаць.

«Беларускае кіно так ці інакш заўсёды прысутнічала ў праграме кінафоруму. Гэта і «Кіндэрвілейскі прывід» Алены Туравай, і «У тумане» Сяргея Лазніцы, і «Роля» Кастуся Лапушанскага, — **каментуе дырэктар праграм ігравога кіно кінафестывалю Ігар СУКМАНАЎ**. — Мы падыходзім да выбару конкурсных карцін з павышанымі патрабаваннямі. Фільмы-ўдзельнікі — гэта фільмы, якія маюць сур'ёзную рэпутацыю, узнагароды на аўтарытэтных кінафорумах. Некаторыя абмежаванні таксама не дазваляюць нам запрашаць малыя формы, бо мы працуем у асноўным з фарматам поўнага метра. У сувязі з гэтым беларускаму кантэнту бывае складана далучыцца да фестывалю. Нам важны гонар мундзіра. З другога боку, «Лістапад» павінен мець нешта, звязанае з нацыянальным кіно. Таму мы вырашылі паспрабаваць зрабіць нацыянальны конкурс, не ставячы фільтраў. Мы прымаем поўны метр, кароткі метр, анімацыйнае, дакументальнае, вядомае, невядомае — любое кіно.

Крытэрый адбору ўсё роўна даволі высокі. Мы разглядаем толькі тыя фільмы, якія маюць дачыненне да паняцця «мастацтва кіно». Нас цікавяць беларускія аўтары, якія спрабуюць выказаць нешта звязанае з самаідэнтыфікацыяй. І не важна, у якой частцы свету яны жывуць».

Гэты конкурс, калі ён сапраўды прапануе не прадукт, а мастацтва, здольны заявіць пра беларускае кіно на міжнародным фестывалі, што павінна згуляць на руку яго іміджу. Пакуль невядома, колькі карцін будзе ўдзельнічаць у конкурсе. Але нават калі адпаведных крытэрыям адбору карцін будзе некалькі — яны на належным узроўні прадставяць нацыянальнае кіно.

«Наша ўяўленне пра беларускае кіно часцей за ўсё запаралелена з прадуктам «Беларусьфільма». Між тым перыядычна ўсплываюць цікавыя работы маладых аўтараў. Наша задача — кінуць невад і нешта з ім выцягнуць. Пакуль што складана сказаць, што мы з яго атрымаем. Я поўны аптымізму, бо за невялікі тэрмін з тых часоў, як абвешчаны адбор, бачу цікавыя працы, якія ў мяне выклікаюць энтузіязм», — прадоўжыў Ігар Сукманаў.

XXI Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» у гэтым годзе адбудзецца з 7 па 14 лістапада і, традыцыйна, абяцае стаць святам «мастацтва кіно», якога нам так не хапае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

■ Без гучных слоў

# ДЗВЕ ВЯРШЫНІ АЛЯКСЕЯ

**Студэнт першага курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Аляксей Варывода ўзняўся на вяршыню дзеючага вулкана Эль-Місці і ўстанавіў там сцяг свайго ўніверсітэта.**

Узыходжанне было здзейснена ў складзе беларускай экспедыцыі праекта «Сем вяршынь». Усяго ўдзел у экспедыцыі ўзялі 14 альпіністаў-аматараў, 6 з іх — жанчыны. Аляксею Варыводу, самаму юнаму ўдзельніку экспедыцыі, усяго 17 гадоў. Гэтым летам ён стаў студэнтам факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР. На адкрытым залічэнні ва ўніверсітэт рэктар Міхаіл Батура ўручыў Аляксею сцяг універсітэта.

Вышыня вулкана, які знаходзіцца на тэрыторыі Перу, складае 5 822 метры. Узыходжанне на вяршыню і спуск да падножжа вулкана ўдзельнікі экспедыцыі здзейснілі за рэкордны для такой вышыні час — 24 гадзіны. Між іншым, альпінізмам хлопец захапіўся адносна нядаўна — прыкладна два гады таму. А летам мінулага года разам з групай альпіністаў ён ужо ўзнімаўся на вяршыню ў Малайзіі, вышыня якой была каля 4,5 тысячы метраў. Цікава, што навучанне ў БДУІР — гэта ўжо традыцыя ў сям'і Аляксея Варыводы. Адукацыю ў гэтай ВНУ атрымлівалі яго бацька, маці і дзядзька. А дзядуля нават выкладаў там на працягу пяцідзесяці гадоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**





**Вось і ўсё. Апошні летні дзень**
**Дагарэў, як свечка дагарае,**
**І бліжэе цень з-за небакраю —**
**Восеньскіх часоў халодны цень.**

**Не шкадуй, бо спраўдзіцца ізноў**
**Тое, што табе жаўрук прарочыў:**
**Хто не зведаў холад зімняй ночы,**
**Не убачыць майскіх светлых сноў.**



■ Кніжная паліца

# «ДАВАЙЦЕ ЗНАЁМІЦЦА»

**Пад такой назвай у Беларусі з'явілася першая за ўсю гісторыю анталогія айчыннай аўтарскай песні**

Адметна тое, што яе амаль усё жыццё па крупінках збіраў вялікі аматар гэтага жанру магілёўскі бард Сяргей Гамаюнаў. У кнізе больш чым на 500 старонках прадстаўлена творчасць 80 беларускіх аўтараў з іх візітнымі карткамі і дыскаграфіяй. Сярод невядомых шырокаму колу імён ёсць і такія, якія на слыху, — мінчанін Алесь Камоцкі, магілёўскі спявак Аляксандр Баль.

— Творчасць гэтых людзей цалкам адрозніваецца ад «папсы» і так званага шансона, — кажа Сяргей. — У аўтарскай песні галоўнае — словы. У іх радках музыка жыве з моманту нараджэння. На жаль, я не паспеў уключыць у спіс яшчэ шмат іншых аўтараў. Але ж нельга ахапіць неабсяжнае. Спадзяюся, што нехта складзе больш поўны збор, сапраўдную анталогію аўтарскай песні Беларусі.

Кніга ўбачыла свет дзякуючы магілёўскаму прадпрыемству «Магатэкс,» якое з'яўляецца спонсарам музычна-спартыўнага свята «Вялікая бард-рыбалка». Менавіта гэты праект падтрымлівае бардаўскі рух у краіне. На жаль, пакуль тыраж абмежаваны — усяго 1000 асобнікаў. Але кнігу можна знайсці ў бібліятэках вобласці.

— У будучым плануецца дапоўніць анталогію і перавыдаць яе ўжо ў 2 тамах, — супакоіў адзін з аўтараў гэтага выдання кіраўнік праекта «Вялікая бард-рыбалка» Сяргей Кулягін. — Ёсць таксама задумка прыкласці да выдання дыскі з запісамі ўсіх аўтараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ На свае вочы

# ІХ НОРАВЫ, НАШЫ СПАКУСЫ

**Карэспандэнт «Звязды» не ўбачыла ў Егіпце пірамід, але заўважыла шмат цікавага**

**У Шарм-эль-Шэйху асноўная мова на шыльдах крам — руская. Потым некалькі меншымі літарамі — тое ж самае па англійску і арабску. Пры гэтым цана на ўсё для турыстаў і сваіх будзе адрознівацца мінімум у два-тры разы. У сезон манга каштуе $2 за кілаграм для нас, мясцовыя на $1 купяць усе 5. На нас, славянах, няблага зарабляюць.**

Фі, Егіпет... Так расчаравана рэагавалі на мой маршрут адпачынку некаторыя знаёмыя, якія гэтую краіну ўпершыню наведалі гадоў 10 таму, пабывалі разоў пяць у ёй і столькі ж у Турцыі і цяпер спрабуюць іншыя, таксама больш-меньш танныя варыянты, накшталт Таіланда, Грэцыі, Балгарыі або Чарнагорыі.

Такім чынам, мне, напэўна, павінна быць сорамна, але ж Егіпет прыадкрыўся для мяне ўпершыню. І тое далёка не ўвесь, а толькі яго азіяцкая частка. І тут расчаравана зноў скажуць «фі» тыя падарожнікі, якія ўпэўнены, што пабываць у краіне фараонаў і не пабачыць іх пампезныя магілкі ў выглядзе пірамід — значыць, дарэмна туды з'ездзіць. Не бачыла пірамід Гізы, не бачыла Ніла і сфінкса — каюся. Калі атрымаецца, можа выпраўлюся. У маім падарожжы цяпер — толькі горны Сінайскі паўвостраў, амыты з усіх бакоў Чырвоным морам. І суб'ектыўны погляд на жыхароў краіны, якія жывуць тым, што зарабляюць на нас, славянах, пры гэтым не страчваюць свайго самабытнага каларыту і традыцый.

— Вы — наш хлеб, — звяртаючыся менавіта да славян на зразумелай рускай, шчыра распавёў маладзенькі егіпцянін, прадстаўнік тураператара на адной з экскурсій. — Рускую ў нас патрэбна вучыць, каб мець годную працу з кар'ернай перспектывай. Я вучыў на працягу года на спецыяльных курсах у Каіры. У нас выкладала ўкраінка, якая выйшла замуж за егіпцяніна. Цяпер трэба ўдасканальвацца, для чаго вельмі хачу трапіць у Санкт-Пецярбург.

Калі ўлічыць, што веданне англійскай мовы тут справа звычайная, імкненне вывучыць яшчэ адну, на якой гавораць наведвальнікі шматлікіх курортаў, можна толькі вітаць. Вось такім чынам гара ідзе да Магамета. Заўважна, што ўвесь малады персанал выкарыстоўвае нас, турыстаў, у якасці жывога дапаможніка па вымаўленні.

«Як-як?» — перапытваюць незразумелае слова. Паўтораць услед і зноў спытаюць — ці правільна? Наш новы знаёмы Ціта, які зарабляў на хлеб тым, што ўгаворваў купіць масаж, віртуозна выкарыстоўваючы не зусім нарматыўную рускую лексіку, дзяліўся складанасцямі сваёй працы:

— Я ж не кусаюся, праўда. На працягу дня ўгаворваеш людзей, ходзіш па пляжы, усміхаешся ўсім, а за дзень так стомішся... Вось да рэвалюцыі цэны былі ў нас куды вышэйшыя і паслугі куды больш запатрабаванымі. Не сталі без справы, як зараз, «ёкарны бабай»!

Натоўпу на масаж сапраўды не відаць, і Ціта зноў ідзе па пляжы, імгненна вылічваючы навічкоў. Між тым, нягледзячы на пэўны вопыт стасункаў са славянамі, нас мясцовыя ўсё роўна ўспрымаюць з пункту гледжання сваіх традыцый. Мы з сяброўкай ідзём па базары след у след за сямейнай парай з Бранска і чуем:

**Егіпецкім мужчынам ажаніцца на радзіме складана: трэба мець шмат грошай, каб загадзя «заплаціць» за нявесту, а потым утрымліваць сям'ю. Таму зараз яны даволі часта заводзяць сабе сяброўак з Еўропы.**

— О! Адзін жонка, другі жонка, трэці жонка... Султан!!!

Падпалкоўнік расійскай арміі Сяргей разгортвае шырокія плечы і відавочна задаволены новым статусам, пакуль яго сапраўдная жонка Наташа думае, як рэагаваць на рэпліку. Дарэчы, егіпцяне жартуюць шмат і з задавальненнем, выкарыстоўваючы любую нагоду.

Адносна бесклапотных мясцовых жыхароў, многія з нас выглядаюць напружанымі і на адпачынку. Здаецца, па гэтай напружанасці егіпцяне вылічаюць і адрозніваюць славян, напрыклад, ад тых жа палякаў, немцаў ці англічан, якіх таксама побач было дастаткова.

Аднойчы мы чакалі сваю экскурсію і нечакана апынуліся ў асяроддзі адной вялізнай арабскай сям'і. Там былі і мужчыны, і жанчыны розных узростаў, і шмат дзяцей — усяго чалавек 20. Трэба дадаць, што якраз закончыўся свяшчэнны для мусульман месяц Рамадан, пасля якога на адпачынак у Шарм-эль-Шэйх прыехала шмат жыхароў Каіра. Вельмі цікава было назіраць за іх узаемаадносінамі паміж сабой. Дарэчы, мяне здзівіла, з якой пяшчотай таты цешыліся з дзецьмі. Маці паводзілі сябе куды больш сціпла ў праяўленні пачуццяў. І да сваіх жанчын мужчыны ставіліся з непрытоенай павагай і любоўю. І гэта быў не нейкі асобны выпадак, а, хутчэй, — заканамернасць.

Пры гэтым адна з маіх знаёмых, якой давялося пажыць сярод егіпцян і нават нарадзіць ад аднаго з іх дзіця, падзялілася сваім досведам у галіне стасункаў з прадстаўнікамі моцнай паловы арабскага насельніцтва:

— Егіпецкім мужчынам ажаніцца на радзіме складана: трэба мець шмат грошай, каб загадзя «заплаціць» за нявесту, а потым утрымліваць сям'ю. Таму зараз яны даволі часта заводзяць сабе сяброўак з Еўропы, якія самі фінансава іх падтрымліваюць.

Той жа 23-гадовы Ціта, які вечарамі ў адзіноцтве курыў кальян у кавярні, шчыра пацвердзіў, што гэта амаль норма:

— У мяне ёсць сяброўка ў Англіі, старэйшая за мяне на некалькі гадоў, якая працуе інжынерам і мае вельмі высокі заробак. Хутка прыедзе сюды на адпачынак. Яна мне дорыць шыкоўныя падарункі і чакае да сябе. Пакуль не ведаю, як складуцца нашы стасункі.

Амаль аналагічную гісторыю расказаў закаханы ў расійскую дзяўчыну гандляр усходнімі водарамі Саід. Сапраўды, ніхто не перашкодзіць ажаніцца з еўрапейкай і нарадзіць дзяцей. Але ж паралельна некаторыя з егіпецкіх альфонсаў копяць грошы, якія атрымліваюць ад спонсарак, каб... ажаніцца са сваёй суайчынніцай. Што ўвогуле складана зразумець, законная еўрапейская жонка пра гэта ведае і нават дапамагае часам арганізаваць мусульманскае вяселле.



Між іншым, хоць у Егіпце і ёсць дазвол мець да чатырох жонак адначасова, жыхары гэтай не вельмі багатай краіны ім карыстаюцца рэдка: такую раскошу мала хто можа сабе дазволіць.

Жанчын без мужчыны побач егіпцяне на падсвядомасці ўспрымаюць шукальніцамі прыгод. Менавіта таму, калі вас хвалюе рэпутацыя сярод мясцовага насельніцтва, лепш «прычапіцца» да сямейнай пары і лічыцца ўмоўнай сястрой або другой-трэцяй жонкай. У іншым выпадку





абавязкова пачуеце ўслед нешта накшталт: «Мадам, вам муж патрэбны?»

Дарэчы, некаторыя жанчыны славянскай знешнасці, відаць, карыстаюцца такімі прапановамі — няшмат, але такія міжнацыянальныя рамантычныя парачкі існавалі побач. Не выключаю, што асобныя менавіта для гэтага і прыязджаюць у Егіпет: дзе на радзіме знойдзеш свабоднага непітушчага мужчыну, які няхай на час, але падорыць пяшчотныя эмоцыі і клопат адзінокай жаночай душы... Няхай і за яе грошы.

Дарэчы, увагу, хаця б і на адлегласці, адчуваюць ад мясцовых мужчын літаральна ўсе жанчыны — незалежна ад знешнасці і ўзросту. Паколькі да мусульманскіх жанчын нельга дакранацца не толькі рукой, але і пільна позіркам, нашых на пляжы цемнаскурыя хлопцы разглядаюць прагна.

Тым не менш прыкметы эмансіпацыі не вельмі хутка, але прасочваюцца і ў мусульманскую краіну. Вядома, абсалютная большасць мясцовых жанчын як мінімум у хустцы, і ў ваду яны заходзяць у купальных касцюмах, больш падобных на цёмныя начныя кашулі... І ўсё ж асобныя яўна парушаюць законы ісламу: на пляжы распранаюцца да таго ж стану, што і іх еўрапейскія сёстры. Больш за тое — аднойчы давялося пабачыць двух п'яных арабаў. Мы нават не паверылі ў такі цуд, але ж мясцовыя пацвердзілі, што хлопцы «водка выпілі шмат». Здавалася, што ісламскі свет куды больш актыўна супрацiўляецца маральнаму падзенню і секулярызацыі грамадства, але ж, аказваецца, спакусіць магчыма і іх. З нашай дапамогай у тым ліку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**

■ А не шкодзь!

# ЗА ПАРУШЭННЕ — СУРОВАЕ ПАКАРАННЕ

**Суд Быхаўскага раёна вынес прысуд у дачыненні да двух браканьераў з вёскі Новы Быхаў, якіх затрымалі на Дняпры за незаконнай лоўляй рыбы сеткамі. Тыя за кароткі тэрмін паспелі здабыць 827 асобін розных відаў рыбы. Цяпер ім трэба пакрываць нанесеную прыродзе шкоду ў памеры 18,5 мільёна рублёў. Апроч гэтага яны абодва пазбаўлены волі тэрмінам на два гады з адтэрміноўкай пакарання на 12 месяцаў.**

Прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч прывяла яшчэ не адзін прыклад, калі за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства браканьерам даводзілася адказваць немалымі сумамі штрафаў.

Паляўнічаму-нелегалу, які незаконна здабыў самку дзіка на тэрыторыі Быхаўскага лясгаса, суд прызначыў пакаранне ў выглядзе штрафу 15 мільёнаў рублёў. Акрамя яго, браканьер раней пакрыў нанесеную прыроднаму асяроддзю шкоду ў памеры 6 мільёнаў рублёў. Паляўнічы з Салігорска прызнаны вінаватым у незаконнай здабычы казулі і прыгавораны да выплаты штрафу ў 13 мільёнаў. Гэта нягледзячы на тое, што браканьер прызнаў сваю віну і добраахвотна пакрыў нанесеную шкоду ў памеры 7,8 мільёна рублёў. Жыхара вёскі Смычак, які лавіў рыбу сеткамі на возеры Кольскае, суд Буда-Кашалёўскага раёна прыгаварыў да выплаты 8 мільёнаў штрафу. Паколькі парушэнне было здзейснена ў перыяд забароны, нанесеная прыродзе шкода была памножана на тры і склала 13 мільёнаў рублёў. Штраф на гэтую суму браканьер павінен будзе заплаціць.

# СЛЯДЫ ВЯЛІ Ў КРАСНУЮ СТАРОНКУ...

**Калі работнікам Любанскай міжрайінспекцыі паведамілі пра незаконнае паляванне каля вёскі Красная Старонка Слуцкага раёна, тыя сапраўды на месцы знайшлі напаўразабраную тушу лася. А яшчэ — сляды ад пратэктараў аўтамабіля «УАЗ», якія вялі да вёскі...**

Падчас аператыўных мерапрыемстваў устанавілі падазраванага. Пры аглядзе дома яго маці былі знойдзены пяць поліэтыленавых пакетаў, у якіх ляжалі сэрца, пячонка і ныркі дзікай жывёлы, а таксама мужчынскае адзенне з плямамі бурага колеру і паляўнічы нож са слядамі тлушчу і поўсці. У двары стаяў аўтамабіль «УАЗ» без нумарных знакаў. У яго багажніку дзяржінспектары таксама заўважылі плямы крыві і поўсць лася. Месцазнаходжанне паляўнічага-нелегала зараз устанаўліваецца. Слуцкі раённы аддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу за незаконнае паляванне, якое пацягнула нанясенне шкоды прыродзе ў асабліва буйным памеры — на суму 300 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# «СЕЗОН» ЗАБЛУКАЎШЫХ

**За адны суткі выратавальнікі шэсць разоў былі вымушаны выязджаць на пошукі грамадзян, якія заблукалі.**

У лясным масіве паблізу Жодзіна згубіўся мужчына 1985 года нараджэння. Для пошукавых работ былі задзейнічаны супрацоўнікі РАУС і работнікі МНС. У лесе каля вёскі Выдрэя Лёзненскага раёна заблукалі жанчына і два мужчыны. Іх таксама праз некалькі гадзін адшукалі выратавальнікі. Як і мужчыну з жанчынай у лесе каля вёскі Саўкі Пастаўскага раёна, калі тыя патэлефанавалі ў службу «101». А каля вёскі Шчытоўка пайшлі ў лес і заблукалі трое мужчын. Ужо прыцемкам іх знайшлі работнікі МНС. На шчасце, ніхто з заблукаўшых не пацярпеў.

А Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у чарговы раз заклікае грамадзян, якія выпраўляюцца ў лес, захоўваць правілы бяспекі. За час ягадна-грыбнога сезона ўвогуле па краіне ўжо заблукалі некалькі дзясяткаў чалавек. Выратавальнікі, як правіла, у такіх сітуацыях выязджаюць у лес на аўтацыстэрне і ўключаюць сірэну, якая вельмі добра дапамагае пацярпелым арыентавацца ў лясных угоддзях. Пацярпелыя рухаюцца на гук і выходзяць з іх.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДАПАМОЖАМ АЛЯКСАНДРЫ ВЫРАТАВАЦЬ ЗРОК



Дыягназ, які пастýпова адбірае ў яе дачкі шчасце бачыць навакольны свет, Алена Аўчыннікава пачула ўпершыню, калі рыхтавала Аляксандру ў першы клас. Медкамісія перад школай і выявіла рэўматоідны ўвеіт і катаракту вачэй. Пачалася барацьба за зрок, Алене давялося кінуць працу. У 2002 годзе дзяўчынцы былі праведзены аперацыі ў Германіі пры садзейнічанні фонду дапамогі дзецям свету ў Гановеры і неабыякавых жыхароў Віцебска. Наогул, Аляксандра — мэтанакіраваная дзяўчына. Чатыры гады вучылася дома, а потым — у звычайнай школе. Летась паспяхова здала ЦТ і прайшла на «бюджэт» юрыдычнага факультэта ВДУ імя Машэрава. Атрымлівае павышаную стыпендыю, хоча стаць першакласным спецыялістам. Але зрок працягвае зніжацца: адно вока закрываецца спайкамі, на другім развіваецца глаўкома. Дапамагчы гатовы ў афтальмалагічнай клініцы Dardenne г. Бона. У залежнасці ад складанасці ўмяшання спатрэбіцца ад 15 да 25 тысяч еўра. Маці і дачка сёння жывуць у інтэрнаце, бацька з сям'і пайшоў — самастойна сабраць такую суму ім не пад сілу. Яны спадзяюцца на дапамогу неабыякавых людзей.

*Дабрачынныя рахункі адкрыты ў філіяле № 200 — г. Віцебск, вул. Леніна, 10Б; УНП 300229956; МФО 150801635:*

*беларускія рублі — транзітны рахунак № 3819382103002 на дабрачынны рахунак № 000006;*

*долары ЗША — транзітны рахунак № 3819382100018 на дабрачынны рахунак № 000023;*

*еўра — транзітны рахунак № 3819382100018 на дабрачынны рахунак № 000006;*

*расійскія рублі — транзітны рахунак № 3819382100018 на дабрачынны рахунак № 000005.*

Прызначэнне плацяжу: для залічэння на дабрачынныя рахункі, адкрытыя на імя Аўчыннікавай Алены Леанідаўны на правядзенне аперацыі і рэабілітацыі дачкі Аўчыннікавай Аляксандры Аляксандраўны.

Дадатковая інфармацыя аб атрымальніку сродкаў: тэл. 8 0212 58 72 54, МТС (+375 29) 812 41 03.

■ Напярэдадні

# «СКАРЫНАЎСКІЯ ДНІ» Ў ПОЛАЦКУ

**У рамках святкавання Дня беларускага пісьменства ў самым старажытным горадзе Беларусі з 5 па 7 верасня пройдзе свята «Скарынаўскія дні ў Полацку».**

— А раней будзе рэалізаваны дабрачынны праект «Падары дзецям кнігу», у выніку якога бібліятэкі сацыяльных прытулкаў і школ-інтэрнатаў папоўняцца новымі кнігамі. Падчас «Скарынаўскіх дзён» пройдзе алімпіяда сярод школьнікаў па аратарскім мастацтве і напісанні эсэ, урокі «Полацказнаўства», «Полаччына — мой край родны» па тэмах: «Вялікі сын Полацкай зямлі», «Вялікі пачынальнік Францыск Скарына». Будзе працаваць выстава «Кніга — рэліквія ў маёй сям'і», выстава-прэзентацыя старадаўніх кніг «Мастацтва слова». Арганізуюць і рандэву з кнігамі Францыска Скарыны і Сімяона Полацкага. У праграме таксама акцыя «Кнігі або камп'ютар», — паведамілі «Звяздзе» ў райвыканкаме.

Каля памятнага знака «Ў» дадуць канцэрт навучэнцы Полацкай дзіцячай школы мастацтваў. А ў раённай цэнтральнай бібліятэцы адкрыецца літаратурны бульвар «Чытай-горад», дзе кожны будзе мець магчымасць выпіць гарбаты з «жывым Францыскам Скарынам» і сфатаграфавацца з ім на памяць. Што цікава, там жа будуць кансультаваць на тэму карысці для здароўя чытання некаторых кніг...

Моладзь возьме ўдзел у акцыі «Хвіліна чытання»: будуць чытаць літаратуру на экранах мабільных тэлефонаў. Цікавай абяцае быць і акцыя «Каментарый або каменты». Хлопцы і дзяўчаты прааналізуюць распаўсюджанне слэнгу ў інтэрнэт-прасторы. Мэта мерапрыемства — зразумець вялікую значнасць выкарыстання літаратурнай мовы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Ну і ну!

# ЯК АДЗІН ПРАЙДЗІСВЕТ АБЯЦАЎ МНОГІМ АЖАНІЦЦА, А ПАКІДАЎ БЕЗ ГРОШАЙ,

## або АСТАП БЕНДЭР З МАДАМ ГРЫЦАЦУЕВАЙ АДПАЧЫВАЮЦЬ

**Супрацоўнікі Цэнтральнага РУУС сталіцы затрымалі маладога чалавека, які ўваходзіў у давер да дзяўчат і завалодваў іх рэчамі. Ім аказаўся 30-гадовы раней неаднаразова судзімы за махлярства і крадзяжы ўраджэнец Бабруйска. Пражываў ён у Асіповічах, хаця, як высветлілася, геаграфія яго знаёмстваў толькі гэтым горадам не абмяжоўвалася.**

Малады чалавек заводзіў іх у сацыяльных сетках, падыходзіў да дзяўчат на вуліцах, у парках, кавярнях і г.д. Кавалер прапаноўваў схадзіць на прагулку, у кіно, пры гэтым прыгожа заляцаўся. Не забываўся мімаходзь заўважыць, што ён вельмі забяспечаны, але, вось бяда, адзінокі. Некаторым з дзяўчат малады чалавек прапаноўваў уступіць з ім у шлюб, нават знаёміўся з бацькамі «нявесты», дарыў «каханым» залатыя заручальныя пярсцёнкі, якія, як высветлілася пазней, былі зусім не з каштоўнага металу.

Паводле інфармацыі Цэнтральнага РУУС г. Мінска, «жаніх» меў рамантычныя стасункі адразу з некалькімі ахвярамі. У яго знайшлі восем мабільных тэлефонаў і мноства сім-карт, якія былі зарэгістраваныя на... дзяўчат, з якімі ён сустракаўся. За дзень малады чалавек паспяваў убачыцца адразу з некалькімі прадстаўніцамі чароўнага полу, а таксама пісаў ім СМС-паведамленні. Адначасова гэты прайдзісвет здымаў некалькі кватэр. Прычым кожнай з дзяўчат гаварыў, што жыллё належыць яму і ён хоча, каб яго абранніца пераехала да яго жыць. Дзяўчаты пагаджаліся, перавозілі ў кватэру свае рэчы, а праз некалькі дзён «жаніх» знікаў разам з імі.

З адной з пацярпелых, напрыклад, зламыснік пазнаёміўся на запраўвачнай станцыі, дзе тая працавала. Прапанаваў схадзіць на прагулку, пачаў сустракацца з дзяўчынай. У якасці пацвярджэння сваіх рамантычных пачуццяў паабяцаў звазіць яе на Кіпр, нават узяў пашпарт «абранніцы» — для «афармлення» візы. Потым зняў чарговую кватэру, якую выдаў зноў за сваю ўласную, быццам бы набытую спецыяльна для сумеснага пражывання. Вядома, дзяўчына перавезла да «жаніха» свае рэчы. А праз колькі часу выявіла знікненне іх разам з грашыма, іншымі каштоўнасцямі на агульную суму больш як 50 мільёнаў рублёў. Не было ў кватэры і «каханага»... Яшчэ адну дзяўчыну малады чалавек угаварыў аформіць на сябе крэдыт, а грошы перадаць яму. Увогуле, праваахоўнікі мяркуюць, што спіс ахвяр можа быць нашмат большым, чым вядома зараз.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Першая дапамога

# КАЛІ ДЗІЦЯЦІ ДРЭННА



**Справакаваць ваніты могуць укачванне або непрыемны пах, аднак хваравіты стан бывае звязаны і з захворваннямі галаўнога мозга, расстройствам мазгавога кровазвароту, эмацыянальным расстройствам.**

Ваніты — гэта і праява раздражнення слізістай абалонкі страўніка, кішэчніка, печані, жоўцевага пузыра, нырак, запалення брушыны, унутраных палавых органаў у жанчыны. На рвотны цэнтр могуць уздзейнічаць раздражненні кораня языка, глоткі, зеву, розныя яды, таксіны бактэрый і ўласныя таксічныя рэчывы, якія не выводзяцца пры цяжкіх захворваннях нырак, печані, глыбокіх абменных парушэннях у выніку эндакрынных хвароб.

Ваніты — спадарожнік і многіх інфекцыйных паталогій. Пры гэтым яны могуць быць аднаразовымі. Як, скажам, пры іерсініёзе, вірусным гепатыце. Вось чаму так важна ведаць, з чым жа звязаны такі «эпізод» у вашага дзіцяці.

Спецыфічнага лячэння ванітаў не існуе — яно звязана з лячэннем асноўнага захворвання, нагадвае **інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ**. У большасці выпадкаў ванітам папярэднічае млосць, павышанае слінааддзяленне, пачашчанае дыханне. А суправаджаецца непрыемны працэс бледнасцю скуры, павышаным потааддзяленнем, рэзкай слабасцю, пачашчаным сэрцабіццём і зніжэннем артэрыяльнага ціску.

**Калі дзіця ванітуе, неабходна выклікаць на дом урача-педыятра, які ўстановіць прычыну такога сімптому. Пакуль будзеце чакаць доктара, давайце маламу піць — адвар рамонку, мінеральную ваду «Мінск-4» без газу**. Нельга даваць малако і малочныя прадукты. З лекавых прэпаратаў падыдуць гастраліт (пры атручэннях), рэгідрон. Пры павышэнні тэмпературы цела звыш 39 градусаў неабходна выклікаць «хуткую», а пры 38,5 дазваляецца прымяніць гарачкапаніжальны прэпарат (ібупрафен, парацэтамол, спецыяльныя гарачкапаніжальныя свечкі).

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## извещает о проведении открытого аукциона по продаже в г. Барановичи ресторана «Домашний круг», принадлежащего ЗАО «АТЛАНТ»

| Лот № 1 | Изолированное нежилое помещение ресторан «Домашний круг» с инв. № 110/D-2767184 | Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, б-р Бородинского, 4/1-1 | Площадь, м² | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1119,8 | 11 814 615 120 | 118 146 151 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

Назначение – помещение общественного питания. Наименование – ресторан «Домашний круг». Год постройки – 1980. Этаж – 1, цокольный. Общая площадь – 1119,8 м². Стены, перегородки – кирпичные, оштукатуренные. Перекрытия – ж/б. Крыша – рулонная совмещенная. Полы – деревянные, плитка, паркет, бетон. Проемы оконные – деревянные, стеклоблоки, роллет, металл. сетка. Проемы дверные – деревянные, металлические, МДФ. Внутренняя отделка – штукатурка, окраска, плитка. Отопление – чугунные радиаторы. Водопровод – газоводопроводные трубы. Электроснабжение – скрытая проводка. Канализация – чугунные трубы. Горячее водоснабжение – централизовано. Ванные (души), электроплиты, вентиляция, радио, телевидение, телефон, лифты – есть.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Покупателем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона затраты на:
- определение рыночной цены Объекта в размере 4 375 300 (Четыре миллиона триста семьдесят пять тысяч триста) белорусских рублей с учетом НДС 20%;
- организацию аукциона, но не более 20 000 000 (Двадцати миллионов) белорусских рублей.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % (одного процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. Оборудование реализуется по отдельному договору купли-продажи при заинтересованности Победителя аукциона (Претендента на покупку). В случае отказа Победителя аукциона (Претендента на покупку) от приобретения оборудования, срок вывоза оборудования Продавцом будет оговариваться в договоре.
6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 10.10.2014 в 11.30 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 61**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «АТЛАНТ» (ресторан), **проводимом 10 октября 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений – **07.10.2014 в 12.00.**

**Заключительная регистрация участников – 10.10.2014 с 11.00 до 11.30 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Разумов Александр Михайлович 8(0163) 48-60-55.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот № 1 с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже единым лотом имущества, принадлежащего ИЧП «АРМАКАН-ПВХ», находящегося по адресу: 231300, г. Волковыск, ул. С. Панковой, 65

| № лота | № п/п | Наименование и характеристики продаваемого имущества | Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС) | Задаток, руб. (10% от начальной цены) | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | Капитальное строение – здание цеха нестандартного оборудования – 1001,0 м. кв., инв. № 410/С-23922 – 317 100 000 рублей. | | | |
| | 2 | Капитальное строение – здание экспериментального участка – 908,9 м. кв., инв. № 410/С-25476 – 382 900 000 рублей. | | | |
| | 3 | Капитальное строение – рама лесопильная – 356,6 м. кв., инв. № 410/С25474 – 142 100 000 рублей. | | | |
| | 4 | Капитальное строение – будка сторожевая – 8,6 м. кв., инв. № 0000004/410/С-25475 – 5 516 000 рублей. | | | |
| | 5 | Капитальное строение – склад-теплица 1150,9 м. кв., инв. № 410/С-25473 – 329 700 000 рублей | | | |
| 1 | 6 | Сооружение – склад № 6 пиломатериалов 152,85 м, с инв. № 410/С-25472 – 36 540 000 рублей. | 1 719 426 100 | 171 942 600 | 5 |
| | 7 | Сооружение – ограждение, 502,7 м, с инв. № 410/С-25478 – 95 900 000 рублей. | | | |
| | 8 | Сооружение – внутризаводские автомобильные дороги, а/б, – 377 м, с инв. № 410/С-25479 – 361 900 000 рублей. | | | |
| | 9 | Сооружение – внутренние ж/д пути – 210,4 м, с инв. № 410/С-25477 – 45 430 000 рублей. | | | |
| | 10 | Перегородка из стального листа 0,5/2,5/14 – 219 100 рублей. | | | |
| | 11 | КТП 1000/100/0,4 (внутренней установки) – 2 021 600 рублей. | | | |
| | 12 | Распределительный пункт 9272 – 49 700 рублей. | | | |
| | 13 | Распределительный пункт 9272 – 49 700 рублей. | | | |

**Аукцион состоится 07 октября 2014 года в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. С. Панковой, 65, к. 216 (2 эт.). Заключительная регистрация участников аукциона – 07 октября 2014 года с 10.30. до 11.00.**

Организатор аукциона – управляющий ИЧП «АРМАКАН-ПВХ» Бахуревич Е. В., тел.(8-029) 3608384.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. **Оплатить задаток** на расчетный счет 3012015893504 в филиале № 402 ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Волковыск, код 689, УНП 590740021.

2. **По 06 октября 2014 г. включительно до 16.00 подать заявление** на участие в аукционе и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: 230025, г. Гродно-25, а/я 13.

В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

**Более подробная информация об условиях участия в аукционе, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Рэспубліка» от 19.06.2014**.

**Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8029-360-8384.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «АТЛАНТ»

Предлагается к продаже в г. Минске трехэтажное капитальное строение (площадь – 970,8 м²) 1993 года постройки, оснащенное всеми видами коммуникаций, с площадкой для погрузки, разгрузки и хранения железнодорожных грузов (контейнерная площадка, площадь – 3479 м²) с примыкающей железнодорожной веткой, расположенное на земельном участке площадью 0,4826 га. Имеется стоянка для автомобилей. В непосредственной близости находятся автобусная остановка и станция метро «Молодежная».

| Лот № 1 | Служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой с инв. № 500/С-41498 | адрес: г. Минск, пер. Домашевский, д. 4 | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 097 299 | 10 972 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

Назначение – здание специализированное иного назначения. Наименование – служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой, литер А 3/к. Год постройки – 1993. Число этажей – 3. Площадь застройки – 556 м². Общая площадь – 970,8 м². Фундамент – сборные ж/б блоки. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Крыша – мягкая рулонная. Полы – линолеум, плиточные, бетонные. Проемы оконные – двойные деревянные. Проемы дверные – щитовые, металлические. Наружная отделка цоколя – окрашен. Наружная отделка стен – оштукатурены, окрашены. Внутренняя отделка – облицовано плиткой, окрашено, оклеено обоями. Отопление – центральное, чугунные трубы, радиаторы. Водопровод – стальные трубы, от уличной сети. Электроснабжение – скрытая проводка. Канализация, горячее водоснабжение – центральная, чугунные трубы. Вентиляция, ванные, напольные электроплиты, радио, телефон – есть.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,4826 га с кадастровым номером 500000000005003550. Целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания здания специализированного иного назначения (служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой). На земельном участке расположено имущество, не выставленное на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Часть кап. строения с инв. № 500/С-41498 сдается по договору аренды на срок по 31.10.2014 (арендуемая площадь 215,35 м²). Объект находится в плане перспективной застройки г. Минска.

Земельный участок площадью 0,4826 га с кадастровым номером 500000000005003550 сдается по договору аренды ЗАО «АТЛАНТ» на срок по 31.01.2049. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, площадь 0,1224 га.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Валюта торгов – доллар США.
3. Валюта платежа – белорусский рубль.
4. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.
Сумма для оплаты Объекта производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу в течение 10 (Десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона затраты на:
- определение рыночной стоимости Объекта в размере 6 880 000 (Шесть миллионов восемьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей с учетом НДС 20%;
- организацию аукциона, но не более 40 000 000 (Сорока миллионов) белорусских рублей.
6. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % (одного процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Сумма для оплаты вознаграждения производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на дату подписания протокола о результатах аукциона.
7. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
8. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 10.10.2014 в 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 61.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «АТЛАНТ» (служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой), **проводимом 10 октября 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. **Окончание приема заявлений – 07.10.2014 в 12.00.**

**Заключительная регистрация участников – 10.10.2014 с 10.00 до 10.30 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Бабин Владимир Анатольевич 8 (017) 218-63-02, 8(029) 648-60-18.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

# НЯПРОСТЫЯ СУСЕДЗІ



Сёння пачынаецца чарговы сезон Кантынентальнай хакейнай лігі

Фотаздымкі БЕЛТА.

**У сувязі з тым, што фіналіст мінулага чэмпіянату пражскі «Леў» адмовіўся ад удзелу ў сезоне 2014/2015, дзеючы чэмпіён магнітагорскі «Металург» у матчы Кубка адкрыцця 3 верасня будзе прымаць уладальніка Кубка Кантынента 2014 — маскоўскае «Дынама».**

Усе каманды ў гэтым сезоне правядуць па 60 гульняў. У складзе ўдзельнікаў адбыліся сур'ёзныя змены: дэбютаваць у лізе будзе фінскі «Ёкерыт» і расійскі «Сочы», пасля некалькіх сезонаў адсутнасці ў КХЛ вяртаецца «Лада». Ёсць і страты: не прымуць удзел у розыгрышы Кубка Гагарына «Спартак», «Леў» і «Данбас».

Наша ўвага, вядома, будзе прыкавана да мінскага «Дынама». Усе мы, безумоўна, чакаем, калі беларускаму клубу нарэшце ўдасца прабіцца ў плэй-оф чэмпіянату. Аднак за «зуброў» становіцца крыху трывожна, бо суседзі па дывізіёне ў нас падабраліся няпростыя, а згуляць з імі нам трэба будзе ажно па 4 разы. Разгледзім асноўных канкурэнтаў мінскага «Дынама» па дывізіёне Баброва.

## СКА

З моманту ўтварэння КХЛ «армейцы» з берагоў Нявы кожны год лічацца аднымі з галоўных фаварытаў сезону, але раз за разам «пралятаюць» міма кубка. За шэсць гадоў СКА ні разу не дабраўся да фіналу. У гэтым годзе ёсць усе перадумовы, каб змяніць сітуацыю: на чале каманды сталі людзі, якія ведаюць, як перамагаць. Вячаслаў Быкаў і Ігар Захаркін ужо маюць вопыт працы з амбіцыёзнымі калектывамі. У 2011 годзе ўзначалены імі «Салават Юлаеў» на шляху да Кубка Гагарына прайграў толькі 4 матчы.

Што тычыцца піцерцаў, то яны заўсёды дэманструюць даволі высокі ўзровень майстэрства, але пры ўпартасці саперніка — здольныя памыляцца. Акрамя таго, у СКА існуе варатарская праблема. У камандзе застаўся Салак, але па папярэднім сезоне нельга сказаць, што ён цудоўны варатар.

Набыцці ў міжсезонне піцерцы зрабілі нядрэнныя. Да іх перайшоў вопытны 34-гадовы гулец алімпійскай зборнай Швецыі Джымі Эрыксан. Хакеіст зборнай Расіі Антон Бялоў, які да свайго ад'езду ў «Эдмантан» быў адным з лепшых абаронцаў КХЛ, і ў гэтым сезоне павінен стаць галоўным звяном у абароне СКА. Таксама ў Піцер пераехаў лепшы снайпер і бамбардзір «Данбаса» Яўген Дадонаў. Адзначым, што ў каманду вярнуўся і Яўген Расянскі.

З вялікай доляй верагоднасці можна сказаць, што на Захадзе асноўным фаварытам рэгулярнага чэмпіянату будзе менавіта СКА.

## «АТЛАНТ»

Для «Атланта» мінулы сезон атрымаўся няўдалым: упершыню за гады выступлення ў КХЛ каманда не патрапіла ў плэй-оф: не хапіла ўсяго шасці ачкоў. А ў Кубку надзеі падмаскоўныя хакеісты саступілі ў чвэрцьфінале нашаму «Дынама».

**Галоўны трэнер Аляксей КУДАШОЎ** застаўся на сваёй пасадзе, адмовіўшыся дзеля працы ў «Атланце» ад прапановы ўзначаліць маладзёжную зборную Расіі. Да ўсяго іншага вясной клуб адчуваў эканамічныя праблемы, таму кампанія па фарміраванні складу стартавала толькі ў канцы мая. «Атлант» страціў абодвух галкіпераў: Станіслаў Галімаў перабраўся ў ЦСКА, а Сяргей Барысаў падпісаў кантракт з «Амурам». Сышлі таксама лідар па ачках сярод абаронцаў — Рафаэль Батыршын, вопытны Віталь Ацюшоў, Яўген Арцюхін, Аляксей Міхноў і Юкі-Пекі Хаатая.

— Мы істотна скарацілі свой бюджэт, таму падбівалі гульцоў, зыходзячы з цаныякасці і магчымасцяў нашага клуба, — патлумачыў гэтыя рашэнні Кудашоў.

Сярод навічкоў «Атланта» — беларус Дзмітрый Корабаў, які вярнуўся з-за акіяна, амерыканец Мэт Гілрой, на рахунку якога больш за дзвесце матчаў у НХЛ, а таксама тры хакеісты «Льва»: гэта галкіпер Аце Энгрэн, абаронца Ондржэй Немец і форвард Пётр Врана. Падпісалі кантракты з падмаскоўным клубам вопытныя Вячаслаў Казлоў і Андрэй Таратухін.

«Атлант» гатовы да подзвігаў у маючым адбыцца сезоне, а Аляксей Кудашоў да рэабілітацыі перад кіраўніцтвам.

## «ЁКЕРЫТ»

Без сумневу, дэбютант КХЛ, «Ёкерыт», у Заходняй канферэнцыі зойме месца ў чацвёрцы. Не выключана і тое, што фінскі клуб з ходу ўсё ж такі не заваюе Кубак Гагарына. Склад «Ёкерыта» — гэта зборная Еўропы ў мініяцюры. Такая ж, як леташні «Леў», толькі яшчэ мацней. Касцяк каманды склаўся з фінскіх гульцоў і добрых замежнікаў. Узяць хоць бы звязку Лінус Умарк — Юхан Хар'ю. Навідавоку будзе і ўжо ўпадабаны КХЛаўскімі заўзятарамі Аалтанен. Але галоўнай «зоркай» «Ёкерыта» па-ранейшаму можа стаць іншы хакеіст — Ціему Селяне, які ў стане зрабіць сюрпрыз і вярнуцца ў родны клуб.

Не варта забываць, што на чале «Ёкерыта» стаіць тандэм, які ў апошні час працаваў у зборнай Фінляндыі. Пост генеральнага менеджара займае легендарны Яры Куры, а галоўным трэнерам прызначаны Эрка Вестэрлунд — той самы, каму ўдалося абыграць Зінетулу Білялетдзінава на сочынскай Алімпіядзе. Так што ў праходжанні ў плэй-оф «Ёкерыта» сумнявацца не прыходзіцца.



## СЛОВАН

Мінулы сезон атрымаўся для «Слована» няўдалым. У адрозненне ад дэбютнага чэмпіянату, браціслаўцы не змаглі прабіцца ў плэй-оф, фінішаваўшы на 11-м месцы ў Заходняй канферэнцыі. У Кубку надзеі каманда вылецела ў першым жа раўндзе, прайграўшы нашаму «Дынама».

Нягледзячы на гэта, кіраўніцтва «Слована» не стала рабіць карэнных змен. Галоўным трэнерам каманды застаўся Расціслаў Чада.

Самай значнай стратай для клуба ў міжсезонне стаў ветэран Міраслаў Шатан, які ва ўзросце 39 гадоў завяршыў кар'еру гульца. Акрамя Шатана, славацкі клуб пакінуў галкіпер Міраслаў Копржыва, нападаючыя Раман Кукумберг, Міхель Міклік і 19-гадовы форвард Марка Дане.

«Пасля няўдалага сезона мы хочам павялічыць колькасць легіянераў у камандзе. Нам патрэбны хакеісты, якія прапаведуюць іншы стыль гульні. Мы цікавімся некалькімі хлопцамі з-за мяжы», — заявіў Чада перад пачаткам міжсезоння і такіх гульцоў знайшоў. «Слован» папоўніў галкіпер «Віцязя» Юхан Баклунд, абаронцы Керціс Фостэр («Мядзвешчак») і Іван Баранка («Авангард»).

Сярод новых нападаючых адзначым Ладзіслава Надзя, а таксама славенскі дуэт Жыга Егліч — Рок Цічар. Абодва хакеісты выдатна згулялі на Алімпіядзе ў Сочы.

Шанцы палепшыць леташні вынік у «Слован» вялікія.

## «ДЫНАМА» РЫГА

У рэгулярным чэмпіянаце мінулага сезона каманда Арціса Абалса заняла пятае месца. Сапернікам «Дынама» ў першым раўндзе плэй-оф стаў «Данбас», які і не пусціў латвійскі клуб далей.

У міжсезонне ў рыжан, як і ў многіх іншых клубаў КХЛ, узніклі фінансавыя складанасці, і таму ўдзел «Дынама» ў лізе быў пад пагрозай. Аднак усё вырашылася станоўча, і ў сярэдзіне ліпеня кіраўніцтва пачало займацца падборам гульцоў.

— Так, мы крыху зацягнулі з камплектацыяй каманды, але ў цэлым задаволеныя тым, як праходзяць зборы. У нас няма бюджэту, каб утрымаць вядучых гульцоў, так што мы прывыклі да таго, што хакеісты прыходзяць, робяць у нас у клубе сабе пэўнае імя, а потым сыходзяць на больш высокія кантракты. Гэта нармальны працэс, — сказаў **генеральны менеджар рыжан Нормунд СЕЕЙС.**

Страты «Дынама» вельмі значныя. Сышоў самы выніковы абаронца каманды Мэт Робінсан, Сандзіс Озалінш завяршыў кар'еру гульца, пакінуў клуб лепшы бамбардзір Кайл Уілсан, Пол Шчахура, Мікаэль Тэлквіст, Джэймі Джонсан, Рустам Бегаў і Артур Кузьмянкоў.

Узмацніліся рыжане толькі трыма хакеістамі: у «Дынама» перайшоў Пётр Шчаслівы, Мікеліс Рэдліхс і Чэй Генавей.

У гэтым сезоне мы ўбачым новае «Дынама», змагацца за плэй-оф якому будзе вельмі цяжка пераважна толькі на маральна-валявых.

## «МЯДЗВЯШЧАК»

«Мядзвяшчак» — галоўная сенсацыя мінулага рэгулярнага чэмпіянату КХЛ, у першым жа сезоне клуб здолеў прабіцца ў плэй-оф і паказаць пры гэтым яшчэ атакуючы і сілавы хакей. У плэй-оф «Мядзвяшчак» прайграў будучаму фіналісту — «Льву».

Каманду пакінуў галоўны трэнер Марк Фрэнч, яму на змену прыйшоў амерыканскі спецыяліст Чак Уэбер, які чатыры апошнія сезоны працаваў у АХЛ памочнікам галоўнага трэнера «Сан-Антоніа Рэмпейдж».

Паўтарыць леташні поспех новаму настаўніку «Мядзведзяў» будзе вельмі няпроста. У міжсезонне каманду пакінула вялікая група гульцоў, сярод якіх лідары. З заграбскага клуба адразу некалькі хакеістаў перабраліся ў Мінск, сярод якіх лепшы бамбардзір Джонатан Чычу, Мэт Элісан, Чарльз Лінглет, Раян Веске, Іван Шварн.

Адзначым, што заграбскі клуб валодае самым сціплым бюджэтам у лізе, але тым не менш «дазволіў сабе» двух канадцаў — Джэйсана Крога і Дарэна Хейдара.

З улікам мінулага сезона чаканні будуць высокія, але паўтарыць поспех «Мядзвяшчаку» будзе складана.

— У мінулым сезоне каманда і клуб дасягнулі велізарных поспехаў, і цяпер нам трэба будзе працягнуць іх працу. Наша мэта — выхад у плэй-оф, а жаданне — перамагчы ў чэмпіянаце і добра згуляць на Кубку Шпэнглера. Гэта будзе мой першы вопыт у КХЛ, але выдатны трэнерскі штаб — Федарчук, Летанг, Рацей і Мохарыч — дапаможа мне і паспрабуе маю філасофію сумясціць са сваімі ведамі, — сказаў **галоўны трэнер Чак УЭБЕР.**

Што тычыцца дывізіёна Тарасава, з камандамі якога нам таксама давядзецца весці барацьбу за плэй-оф, то там аўтсайдараў няма наогул. «Віцязь» значна ўзмацніўся, «Сочы» будзе імкнуцца паказаць максімум у сваім дэбюце, «Тарпеда» заўсёды адрознівалася сваёй валявой гульнёй, а ЦСКА, «Лакаматыў», маскоўскае «Дынама» і «Поўначсталь» у прадстаўленні не маюць патрэбы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

### Заходняя канферэнцыя КХЛ

**ДЫВІЗІЁН БАБРОВА:**
— «Атлант»
— «Дынама-Мінск»
— «Дынама-Рыга»
— «Ёкерыт»
— «Мядзвешчак»
— СКА
— «Слован»

**ДЫВІЗІЁН ТАРАСАВА:**
— «Віцязь»
— «Дынама-Масква»
— «Лакаматыў»
— «Поўначсталь»
— «Сочы»
— «Тарпеда»
— ЦСКА

*У плэй-оф выходзяць 8 лепшых каманд канферэнцыі.*

■ Запрашальнік

# Глядзіце, вочы, гудзіце, ногі!

## У першую суботу верасня пад Мінскам пройдзе фолк-фэст «Камяніца»

**Адбудзецца ён на тэрыторыі Музея народнай архітэктуры і побыту ўжо ў шосты раз, і сёлета, як плануюць арганізатары, колькасць творчых складнікаў пашырыцца. У дадатак да музычнай праграмы, традыцыйных забаў і пачастункаў стравамі нацыянальнай кухні, пляцовак для рамеснікаў, на «Камяніцу» збяруцца фатографы, дызайнеры і мастакі, якія працуюць у рэчышчы нацыянальнай культуры. «Мы запрасілі да супрацоўніцтва як адукацыйныя праекты, так і проста асобных творчых людзей, якія жадаюць паказаць сваю працу шырокай аўдыторыі», — расказаў каардынатар фестывалю Сяргей Чагрынец.**



Што да музычнай часткі «Камяніцы», то ў ёй ужо звыкла бяруць удзел лепшыя прадстаўнікі беларускай фолк-сцэны і замежныя госці. 6 верасня з 12 да 22 гадзін наведвальнікі фестывалю пачуюць і ўбачаць выступленні артыстаў з Беларусі, Украіны, Польшчы, Чэхіі і Расіі. Нашу краіну прадставяць, без перабольшання, легендарныя калектывы «Троіца» і «Kriwi» з Веранікай Кругловай, а таксама малады электронны гурт «Shuma» са светлавым шоу і рокеры «Rel1kt» з акустычнай фолк-праграмай. На малой сцэне фэсту выступяць гурты «Рада», «Горынь», «Ягорава гара», на вялікай — фолк-тэатр «Яварына». Акрамя таго, гледачоў чакае народны rnb у выкананні «Отава Ё» (Расія), хуліганістыя «Ahmed Ma Hlad» (Чэхія), эксперыменты з рэп-, рок- і фолк-музыкай калектыву «Бандурбэнд» (Украіна) і мультылінгвістычны праект Караліны Ціхай і Бартэка Палыгі (Польшча) — пры падтрымцы «Інстытута Польскага» яны прывязуць у Беларусь праграму, створаную на 9 мовах, на якіх на працягу стагоддзяў размаўляла Беласточчына. Прымусіць танцаваць наведвальнікаў абяцае Алег Скрыпка (лідар украінскага гурта «Воплі Відаплясава»), які прадставіць эксклюзіўны танцавальны дыджэй сэт з этнічным каларытам песень розных краін свету. Алег, дарэчы, ужо ўдзельнічаў у фестывалі ў 2011 годзе, і тады, па меркаванні публікі, стаў адным з самых яркіх выканаўцаў.

Апроч канцэрта, наведвальнікаў чакае кірмаш традыцыйных рамёстваў, старадаўнія танцы і гульні, выставы, майстар-класы і нацыянальныя стравы ад лепшых шэф-кухараў. Як і раней, прадугледжаны бясплатны ўваход для гледачоў у беларускіх нацыянальных строях — пры выкананні адпаведных умоў. Мужчынскі строй павінен складацца з галаўнога ўбора, кашулі, пояса, нагавіц, камізэлькі; жаночы касцюм — з галаўнога ўбора (акрамя дзяўчат), спадніцы, фартуха, кашулі, пояса. Абутак у абодвух выпадках можа быць сучасным.

### ДАРЭЧЫ

**Фестываль «Камяніца», які ладзіцца з 2009 года, мае дабрачынны характар. Усе сродкі ад прададзеных квіткоў (кошт іх — 60 тысяч беларускіх рублёў) ідуць на рахунак Музея народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо пад Мінскам, дзе захоўваецца самая вялікая ў Беларусі калекцыя аўтэнтычнай драўлянай архітэктуры XVIII—XX стагоддзяў.**

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

Даты | Падзеі | Людзі

**301** год — больш за 1700 гадоў таму заснавана найстарэйшая дзяржава Еўропы — Сан-Марына. Рэспубліка Сан-Марына — невялічкая краіна на поўдні Еўропы, размешчаная ў гарыстай мясцовасці, якая не мае выхаду да мора. Адзіны сусед Сан-Марына — Італія. Яе землі цалкам акружаюць тэрыторыю краіны, плошча якой — 61 квадратны кіламетр. Даследчыкі прыпісваюць зараджэнне Сан-Марына муляру Марыну, які заснаваў на схілах гары Тытана хрысціянскую суполку. Цяпер насельніцтва краіны налічвае каля 30 тысяч чалавек, але дзякуючы развітаму турызму штомесяц яе наведваюць у 8 разоў больш людзей.

**1731** год — нарадзіўся (вёска Занкі, цяпер Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці) Станіслаў Іванавіч Богуш-Сестранцэвіч, беларускі вучоны, літаратар, царкоўны дзеяч. З 1773 года епіскап Беларускага епіскапства (цэнтр у Магілёве), з 1782-га — магілёўскі архіепіскап. Мітрапаліт Рымска-каталіцкай царквы Расійскай імперыі (1798-1826). З 1801 года жыў у Пецярбургу, выбіраўся членам Расійскай АН і Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Заснаваў у Магілёве друкарню, дзе выходзілі яго творы па гісторыі і філалогіі: «Аб Заходняй Расіі», «Гісторыя Таўрыды», «Літоўская граматыка». Пісаў вершы, пропаведзі і дыдактычныя творы. Памёр у 1826 годзе.



**1927** год — нарадзіўся (вёска Канюхі Капыльскага раёна Мінскай вобласці) Алесь Адамовіч, беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1980), доктар філалагічных навук (1962), прафесар (1971). З 1954 года працаваў у Інстытуце літаратуры АН Беларусі, з 1987-га — дырэктар НДІ кінамастацтва (Масква). Аўтар дылогіі «Партызаны», раманаў «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой», «Хатынскай аповесці», адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976). Памёр у 1994 годзе.

### Было сказана

**Адам МІЦКЕВІЧ, паэт, публіцыст:**

*«Глядзіш у неба ўгару над сабой,*
*Ды не зірнеш у сябе самога.*
*Ніколі Бога не знойдзе той,*
*Хто толькі ў небе шукае Бога».*

■ Факт

# ЦАРСКІ ПАДАРУНАК

**Экспазіцыю музея землязнаўства геаграфічнага факультэта БДУ папоўнілі бразільскія жэоды (аметысты). Спецыялісты адносяць гэтыя камяні да самых прыгожых геалагічных знаходак.**

Між іншым, у музеі БДУ ўжо ёсць падобныя мінералы, прывезеныя з Урала і Кольскага паўвострава. А 10 унікальных бразільскіх камянёў былі перададзены яму рашэннем спецыяльнай камісіі Міністэрства культуры нашай краіны па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Нагадаем, што 39 узораў неапрацаванага аметысту розных памераў і формаў агульнай вагой каля 350 кілаграмаў былі знойдзены ў пачатку гэтага года супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з кантрабандай Брэсцкай мытні. Па ацэнках экспертаў, адзін такі ўзор каштуе ад адной да дзесяці тысяч долараў.

Акрамя музея землязнаўства БДУ, узоры аметысту атрымалі таксама Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Пушкіна, Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, Нацыянальны гістарычны музей і музей геалогіі і палеанталогіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова.



**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**НАРОДЖАНЫЯ 3 верасня**

**Яны не заўсёды такія, якімі здаюцца на першы погляд. Яны могуць падацца добрымі, нават крыху мяккімі, але заўсёды будуць патрабаваць шчырых і справядлівых адносін і жорстка супрацьстаяць спробам паўплываць на іх ці кіраваць імі. Людзі гэтага дня дэманструюць стрыманасць і цярплівасць, упэўненасць у каштоўнасці іх спраў і працы. Часам іх вабяць спрэчкі і імпульсіўныя дзеянні, таму іх тэмперамент павінен заўсёды быць пад кантролем. Ім неабходна развіваць эмацыянальную паслядоўнасць і сілу волі, каб дасягнуць поспехаў. Галоўная задача — знайсці агульную мову з навакольнымі, паразуменне, прымаць удзел у вырашэнні патрэб іншых людзей і выконваць усе ўскладзеныя на сябе абавязкі.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.12 | 20.08 | 13.56 |
| Віцебск | — 6.10 | 19.45 | 13.35 |
| Магілёў | — 6.13 | 19.44 | 13.31 |
| Гомель | — 6.12 | 19.38 | 13.26 |
| Гродна | — 6.38 | 20.08 | 13.30 |
| Брэст | — 6.41 | 20.06 | 13.25 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 14.11. Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Самуіла.*
***К.*** *Саламона, Сцяпана, Юльяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**У малодшых класах бацькі пытаюцца ў дзяцей:**
**— Якую адзнаку атрымаў?**
**У сярэдніх:**
**— Шмат задалі?**
**У старэйшых:**
**— Ты ў школе быў?**

Перанесеныя ветрам з балкона мужчынскія трусы адной сям'і сталі прычынай разводу ў другой.

**— Я за сваё жыццё ні адной чаркі гарэлкі не выпіў!**
**— Не свішчы! Не можа быць!**
**— Сапраўды! Я шклянкамі гарэлку п'ю!**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.040. Індэкс 63850. Зак. № 3544.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2014 года.